Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І УПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 29 (443) | Пятніца, 11 жніўня 1939 года | Цана 20 кап.

К ПЯЦІГОДДЗЮ ПЕРШАГА З'ЕЗДА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Пяць год аддзяляе нас ад часу, калі на трыбуну Калоннага зала маскоўскага Дома Саюзаў узышоў такі знаёмы, гэтак горача любімы ўсімі народамі зямнага шара першы пролетарскі пісьменнік, заснавальнік пролетарскай літаратуры Аляксей Максімавіч Горкі,—узышоў на трыбуну, каб адкрыць Першы ўсесаюзны з'езд пісьменнікаў.

Гэты «з'езд рыхтавалі не толькі літаратары, з'езд рыхтавала ўся краіна» (Жданаў). На з'езд прыехалі перадавыя пісьменнікі Захаду, якія, па трапнаму вызначэнню тав. Жданава, «з'яўляюцца ядром і зачаткам магутнай арміі пролетарскіх пісьменнікаў, якую створыць сусветная пролетарская рэволюцыя ў зарубежных краінах».

Першы з'езд пісьменнікаў з'явіўся вялікай культурнай падзеяй сусветнага значэння. Такі з'езд мог быць сабран толькі таму, што ў СССР перамог вялікі сцяг Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна. «Такі з'езд, як гэты, не сабраць нікому, апрача нас—большэвікоў»,—сказаў у сваім прывітанні з'езду тав. Жданаў.

Тав. Жданаў і тав. Горкі разгарнулі на з'ездзе шырокія перспектывы далейшага росту совецкай літаратуры, указалі яе бліжэйшыя задачы.

Прайшло пяць год. Многія з указанняў нашай партыі і вялікага Горкага выкананы. Совецкая літаратура ўзнялася на вышэйшую ступень. Паявіліся такія выдатныя кнігі, як «Хлеб» А. Талстога, «Коннікі» Ю. Яноўскага, «Народжаныя бурай» Н. Астроўскага, «Бялее парус адзінокі» В. Катаева, кнігі Макарэнка, «Будучыня» Э. Самуйлёнка. Разышліся ў сотнях тысяч экземпляраў магутныя песні Джамбула Джабаева, Янкі Купалы, Паўло Тычыны. На дзесятках тысяч экранаў прадэманстрыраваны выдатныя фільмы «Мы з Кранштата», «Шчорс», «Ленін у Кастрычніку», трылогія аб Максіме, «Шукальнікі шчасця», «Канцэрт Бетховена», «Пётр І», «Аляксандр Неўскі», «Балтыйцы».

З вялікім поспехам прайшлі ў тэатрах «Чалавек з ружжом» Пагодзіна, «Зямля» Вірты, «Багдан Хмяльніцкі» А. Карнейчука.

У рады пісьменнікаў уліліся сотні новых маладых таварышоў, творы якіх сталі вядомы ўсяму Совецкаму Саюзу. Падрасло і пасталела маладое пакаленне пісьменнікаў ва ўсіх рэспубліках. Партыя і ўрад высока ацанілі рост літаратуры і ўзнагародзілі групу лепшых пісьменнікаў ордэнамі Саюза ССР.

За прайшоўшыя годы літаратура ачышчана ад ашалеўшых дробных буржуа, трацкісцка-бухарынскіх здраднікаў, прамых і ўскосных пасобнікаў класавага ворага. У асяроддзі літаратараў знікнуў, ці амаль знікнуў «важдзізм»—«індывідуалістычнае імкненне мешчаніна стаць на галаву вышэй таварыша, што ўдавалася пры наяўнасці механічнай лоўкасці, пустой галавы і пустога сэрца» (Горкі). Павысіліся патрабаванні да мастацкага ўзроўню твораў, узяты пад абстрэл скороспелыя пустышкі. Пісьменнікі ўсё больш і больш апраўдваюць ганаровую назву «інжынераў чалавечых душ», дадзеную ім таварышам Сталіным.

Перачытваючы гістарычныя прамовы таварышоў Жданава і Горкага на Першым з'ездзе совецкіх пісьменнікаў, кожны літаратар бачыць, як многа яшчэ трэба зрабіць для выканання іх патрабаванняў к літаратуры. Адным з першых сярод іх з'яўляецца «развіццё рэволюцыйнай самасвядомасці пролетарыята, яго любві да радзімы, ствараемай ім, і абароны радзімы». Гэта патрабаванне ідзе па лініі ідэалагічнай накіраванасці літаратуры і высокай мастацкай формы літаратурных твораў.

«Нельга быць інжынерам чалавечых душ, не ведаючы тэхнікі літаратурнай справы. Авалоданне тэхнікай справы, крытычнае засваенне літаратурнай спадчыны ўсіх эпох — уяўляе сабою задачу, без вырашэння якой вы не станеце інжынерамі чалавечых душ»,—папярэджваў тав. Жданаў. Гэта ўказанне жыва і на сёнешні дзень.

Жыва і патрабаванне тав. Горкага аб тым, што пісьменнікі павінны галоўным героем сваіх твораў зрабіць працу совецкага чалавека, павінны стварыць яркі вобраз совецкай жанчыны, палепшыць кіраўніцтва «арміямі пачынаючых пісьменнікаў», наладзіць вывучэнне і паказ «гісторыі мінулага саюзных рэспублік» і многае другое.

Пятая гадавіна Першага з'езда совецкіх пісьменнікаў павінна падштурхнуць грамадскую думку ўсіх літаратараў не толькі на выкананне гэтых задач, але і на набыццё адпаведнага тэмпу ў іх выкананні. Народ, комуністычная партыя, совецкі ўрад і асабіста таварыш Сталін стварылі ўсе ўмовы для магутнага развіцця совецкай літаратуры. Рэшта залежыць ад саміх пісьменнікаў, ад іх штодзённай работы над сабою, над узбраеннем сябе марксізмам-ленінізмам, ад іх вучобы ў жыцця, у партыі, ад іх авалодання здабыткамі культуры мінулых эпох, ад іх сувязі з народам.

Сярод нас няма Аляксея Максімавіча—старшыні Першага з'езда. Яго ўмярцвілі подлыя з подлых ворагі народа. Але слова яго жыве, вучыць і арганізоўвае масы, натхняе нас на подвігі, распальвае і падтрымоўвае нашу нянавісць да фашызма і яго слуг. Мы поўны той вялікай любоўю к працоўнаму народу, к партыі Леніна—Сталіна, к вялікаму другу і настаўніку літаратуры — І. В. Сталіну, якой заўсёды білася сэрца Аляксея Максімавіча Горкага. Мы поўны любві да ўсяго сапраўды чалавечага, сапраўды прыгожага, што так шпарка расце і развіваецца ў краіне Советаў. І ў гэтым залог нашых далейшых поспехаў.

НОВЫЯ ТВОРЫ

ДЗЕДАВА АПАВЯДАННЕ

(Урывак з паэмы „Дзяды і ўнукі")

*

Раман САБАЛЕНКА

*

Бачыш, хлопча, гору тую,
Што паміж сасонак стромкіх
Ля граніцы, дзе вартуюць
Пагранічнікі старонку, —
Той курган даўно насыпан,
Мо гадоў таму ўжо дзвесце.
Тут на гэтым самым месцы,
Лёс крывавы людзям выпаў.

Тут ішлі калісь навалай,
Плоймай лезлі на краіну;
Смерць з касою тут гуляла,
Шмат паклала ў дамавіну.

Тут француз таптаў дарогі,
На Маскву паход свой меціў,
Ды прысталі, мусіць, ногі,
І француз застаўся ў нецях,
У каршэнь схапіў, праклятьі,
Аж пачухаў месца тое.
Ён Расіі не сасватаў,
Хоць лічыў сябе героем.
Люд узняўся, люд вялікі,
Накапіўшы гневу многа.
І з пагардай горда крыкнуў:
— Прэч ідзі сваёй дарогай!
Люд узняўся з чым папала,
Замест шабель косы бралі
І французскую навалу
Як капусту шаткавалі.
Той курган, што паміж сосен —
Помнік нашым змагарам.
Шмат паплакаць давялося
Над ім людзям і вятрам.
Кожны год, пад вечар гэтак,
Нясуць людзі многа кветак.
Пра бацькоў хаваюць памяць,
Не дадуць яе запляміць.
Хто памёр на полі боя —
Вечна будзе жыць героем.

***

Бачыш слуп, і вунь граніца
Прабягае стужкай вузкай.
Мы збіралі там суніцы —
Пачастунак беларускі.
За мяжой суседзі нашы
Праклінаюць лёс і долю.
Там фашыст крывавы, страшны
Адабраў жыццё і волю.

Людзі стогнуць пад пятою,
Накапляюць гнеў магутны;
Там жыццё ідзе к застою,
Галашэнні ўсюды чутны.

Прыдзе час, і люд гаротны
Страпянецца, скіне катаў.
Дзе жыве туга-самотнасць,
Усміхнецца сонца хатам.

У гарачай дружбе людзі
Будуць век жыццём хваліцца.
Час надыйдзе і не будзе
Ні слупоў тут, ні граніцы!

А пакуль, мой хлопча любы,
Рана, рана на спачынак—
Зверы войстраць, точаць зубы
На спакой зямлі-айчыны.

Было, помню, на прадвесні, —
Бацька твой ішоў па лесе,
Толькі выйшаў на прагалак,
Паглядзеў навокал строга:
Стужкай роўнаю дарога
Хмызнякамі прабягала.
Край дарогі куст лазовы,
Заімшэлы, занядбаны;
Мусіць, з восені каровы
З'елі ліст на ім старанна.
Куст шавеліцца надзіва,
Вось правя, дык правя!

Зварухнулася ляніва,
Узнялося нешта млява.
Бацька крыкнуў: «Стой, гадзюка,
А то смерцю пачастую!»
Стрэл раздаўся ўхаластую.
А ў адказ шпіён з нагана—
Кулі тры пусціў у тату.
Бацькаў труп увесь у ранах
Прынеслі суседзі ў хату.
З тых часоў я сам пакляўся
Вечна помсціцца за сына —
Тым, хто гэтак насмяяўся
Над дзіцём нашай краіны.
Хай стары я, хай няздольны,
Слёзы коцяцца з вачэй.
Ім не ўкрасці нашай долі,
Не запляміць нашу чэсць!
Ты, як вырасцеш вялікім,
Станеш дужым, будзеш смелым, —
З тваіго сэрца жальбу выкінь
К груганам, якія цела
Расцярзалі тваіго таты.
Кроплі літасці не знай ты!
Хай яны касцямі лягуць
На зямлі, крывёй палітай.
Сваёй смерцю сваю смагу
Задаволяць хай бандыты.

Бюро даведак

*

Аркадзь КУЛЯШОЎ

*

Выпускнік вясковай сямігодкі
Палышоў пад школьны ганак. Сходкі
На спякоце летняй млеюць, спяць,
Узыходзіць ён:
Ледзь-ледзь рыпяць.

Ён вучыўся тут гадоў з сямі,
Потым свет пабачыў не ў лятунках,
Троссе ў пасажырскім па чыгунках—
Адвыкаў ад школьнае сям'і.

Не адвык.
Цяпер рашае гэтак:
Ад даждку зайдуся, ад расы,
Кінуся ва ўсе бюро даведак,
Пазнаходжу хлопцаў адрасы.

З невядомае для нас прычыны,
Не з хлапцоў пачаў ён, а з дзяўчыны,
Пошукі вандроўныя свае.
(А для гэтага прычын стае).

Вопратка яго з дажджу дыміцца —
Ён яшчэ пад сонцам не прасох;
Шлях размыты,
На траве пясок...
Тут прайшла нядаўна навальніца.
Кій нясе.
У бакавой кішэні
Залатое вечнае пяро.
Хмар апошніх адплываюць цені.
На краю сяла стаіць бюро.

Ён бяжыць з гары,
Мінае гаці...
Там жыве тае дзяўчыны маці,
У яе даведку можна ўзяць.
А яна? Падумае, што зяць.

Цяжка дыша, адчыняе дзверы,
У руках пяро з лістком паперы —
Вось і скончыў пошукі свае...
Вось і маці.
Ён пазнаў яе.
Маці зяця кліча да стала
І частуе
Шчасця поўнай міскай,
Дочку называе юнгштурмісткай
(У юнгштурмаўцы ў гасцях была).

А назаўтра:
Затапіла печ...
А яму дамоў збірацца трэба,
Толькі школа (вось якая рэч!)
І хацінкі гэтае і неба.

А чаму? — не скажа сам, як след.
Ён не муж дзяўчыне, не каханак.
А яна яму?
Юнацкі свет —
У юнгштурмаўку адзеты ранак.

Маці за руку гасця ўзяла,
Колькі слоў сказала напаследак.
Адрас ёсць!
. . . .
Дыміць бюро даведак
Пад гарою, на краю сяла.

Елавец. Хоцімскага раёна.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ І МАСТАЦТВА

На рэспубліканскай выстаўцы соцыялістычнай прамысловасці, якая нядаўна адкрыта ў Мінску ў галоўным корпусе Універсітэцкага гарадка, стаяць бліскучыя варштаты, вырабы швейных і абутковых фабрык, скургалантарэйнай прамысловасці, дрэваапрацоўчых заводаў.. Здавалася-б, дзе тут месца мастацтву, у якім спалучэнні можа яно быць прадстаўлена тут?.. Але, пераступіўшы парог выстаўкі, вы бачыце на ёй і адлюстраванне росту мастацтваў Совецкай Беларусі.

Выстаўку афармлялі лепшыя мастакі Беларусі.

Мастакам (брыгада з 4-х чалавек) паставілі задачу: напісаць для выстаўкі карціны і партрэты лепшых людзей вытворчасці, абароны. Карціны гэтыя намаляваны і намаляваны выдатна. Іх тон гарманіруе з агульным характарам выстаўкі. Вывешаны карціны ў павільёне варштатабудаўніцтва.

Варштатабудаўніцтва — адна з самых маладых галін беларускай соцыялістычнай прамысловасці. Не гледзячы на маладосць вытворчасці, варштаты беларускіх заводаў заваявалі аўтарытэт у рэспубліцы і за яе межамі. Нашы мастакі намалявалі партрэты совецкіх людзей, якія сваімі рукамі стварылі выдатную галіну прамысловасці рэспублікі. Вось Харнас, патомственны металіст,—ён адным з першых прышоў на завод імя Варашылава, тады яшчэ ў невялікую саматужную майстэрню пад гучнай назвай «Энергія»; вось Валчок—малады інжынер-вынаходнік і канструктар, тварэц новых варштатаў, адзначаны ўзнагародай урада. Усе яны знайшлі сабе месца на вялікім маляўнічым палатне «Людзі беларускай прамысловасці».

Побач — палатно, якое паказвае гэтых-жа людзей ідучымі ў баявой шарэнзе. Як сімвалічна гэта! Людзі, якія стаяць ля варштатаў, заўтра па-баявому сігналу возьмуць у рукі вінтоўкі.

У гэтым-жа павільёне вісіць яшчэ адна карціна на вытворчую тэматыку, якая паказвае прасторны і светлы механа-зборачны цэх завода імя Варашылава.

На выстаўцы шмат прац нашых таленавітых самавучак, якія ўмудраюцца рабіць цудоўныя рэчы з самага рознастайнага матэрыялу. Ёсць у Копысі на Аршаншчыне кафлевы завод «Пролетарый». Майстроў гэтага завода з гордасцю называюць «беларускімі палешанамі». Са звычайнай гліны, часта афарбаванай, а іншы раз і натуральнага колеру, на заводзе лепяць прыгожыя статуэткі, сапраўдныя творы мастацтва. На выстаўку майстры завода «Пролетарый» прыслалі шмат выдатных па якасці і мастацкай аддзелцы вырабаў, нагадваючых творчасць славутых палешан.

Вось звычайная кафлевая печка, але назваць яе звычайнай будзе вельмі скромна. Кожная кафля ўпрыгожана цудоўным малюнкам, а складзеныя разам яны ствараюць дзівосную мастацкую карціну, аздобленую беларускім арнаментам.

Галава рыбака, падстаўкі для кветак, пісьмовыя прыборы,—усё гэта з гліны і ўсё па-мастацку афармлена.

Увагу дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР, якія нядаўна старанна аглядалі выстаўку, прыцягнулі ўсе гэтыя простыя, бясхітрасныя творы мастацтва, зробленыя рукамі таленавітага народа.

Вось партрэты Леніна і Сталіна, складзеныя з розных матэрыялаў. Дасягнута вялікае падабенства. Партрэты гэтыя нямечана паслаць у беларускі павільён Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Даўно славяцца нашы ткачыхі і вышывальшчыцы—уздзенскія, віцебскія, слуцкія, бабруйскія. Вышывальнаму мастацтву, мастацкаму ткацтву адведзен на выстаўцы вялікі куток. Цудоўнае панно — калгаснікі пасля багатага ўраджаю адпачываюць у полі... Не верыцца, што яно выткана звычайнай ніткай. Не кісцю, не фарбай, а звычайнай ніткай вытканы цэлы сюжэт. Жывыя твары. Кожны выглядае па-свойму. Родны беларускі пейзаж. Карціна дасканалая. І не мала такіх-жа высокіх твораў народнага мастацтва паказана на выстаўцы.

Мастацтва і жыццё! У багатых экспанатах рэспубліканскай выстаўкі прамысловасці адлюстраван росквіт нашай прамысловасці, росквіт нашага мастацтва.


Выстаўка добра наведваецца і прыцягвае ўвагу людзей самых розных прафесій—студэнтаў, прафесараў, рабочых, калгаснікаў, мастакоў, пісьменнікаў.

Е. САДОЎСКІ.



На Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. **На здымку:** у зале Павільёна друку.

Фотахроніка ТАСС).



У 1941 годзе споўніцца 500 год з дня нараджэння вялікага узбекскага паэта Алішэр Навоі. **На здымку:** навуковы супрацоўнік аддзела ўсходніх рукапісаў Бухарскай Дзяржаўнай бібліятэкі І. Халікаў працуе над тэмай «Аб сучасніках Навоі».

Фотахроніка ТАСС.



Год назад, 6 жніўня, часці доблеснай Чырвонай Арміі сакрушальным ударам разграмілі і адкінулі ад граніц свяшчэннай совецкай зямлі наглых японскіх самураяў, якія спрабавалі пажывіцца за кошт тэрыторыі СССР. Урок, дадзены японцам ля возера Хасан, увойдзе ў гісторыю. Народ ужо сёння складае песні і легенды аб гераічных подвігах доблесных сыноў соцыялістычнай радзімы — камісара Пажарскага, лейтэнанта Леўчэнка, кулямётчыка Гальянава і многіх, многіх другіх, чые імёны сталі гордасцю совецкага народа.

5 і 6 жніўня ўдзельнік хасанаўскіх баёў Герой Совецкага Саюза тав. Леўчэнка прачытаў працоўным сталіцы БССР рад лекцый аб падзеях 6 жніўня 1938 года. Тав. Леўчэнка сустрэўся з рабочымі раду прадпрыемстваў, з партыйным актывам, комсамольцамі і піонерамі горада, выступіў у Доме пісьменніка.

На здымку: Герой Совецкага Саюза капітан Д. Т. Леўчэнка сярод піонераў гор. Мінска.

Фотахроніка БЕЛТА.

А. ФЕЎРАЛЬСКІ

Федэрыко Гарсіа Лорка

(Да трохгоддзя з дня яго забойства)

Калі ў 1635 годзе памёр Лопе дэ Вега, сто шэсцьдзесят іспанскіх паэтаў напісалі вершы, у якіх аплаквалі яго смерць. Калі праз 301 год пасля гэтага загінуў Федэрыко Гарсіа Лорка, падкошаны куляй іспанскіх наёмнікаў германа-італьянскага фашызма, многія і многія паэты Іспаніі і лацінаамерыканскіх краін змясцілі ў журналах і выпусцілі асобнымі выданнямі вершы і паэмы, прысвечаныя яго памяці. І на самой справе: магчыма, з часоў Лопе дэ Вега не было ў Іспаніі паэта, так блізкага народу і так шануемага сваімі субратамі па пяру, як гэты песняр Андалузіі, што загінуў трыццаці сямі год ад нараджэння—у тым-жа ўзросце, што Пушкін і Маякоўскі.

Гарсіа Лорка пакінуў чатыры зборнікі вершаў. У пачатку сваёй паэтычнай дзейнасці ён аддаў даніну ўплыву мадэрнізма, але, сталеючы, як майстар верша, ён усё бліжэй падыходзіў да народнай паэзіі. У сваіх вершах ён развіваў традыцыі іспанскага народнага раманса: іх сюжэты ўзяты з народнага жыцця, яны напоўнены светаадчуваннем сялян і рамеснікаў Андалузіі.

У творчасці Гарсіа Лорка моцна гучэлі рэволюцыйныя матывы. У яго славутым зборніку «Цыганскі рамансеро» змешчан выдатны «Раманс аб іспанскай жандармерыі», у якім паэт з вялікай сілай расказвае аб расправе ненавісных народу жандармаў з «горадам цыганаў» Херэс дэ ля Фронтэра. Гэтыя самыя людзі з «свінцовымі чэрапамі», — так Гарсіа Лорка назваў у сваім рамансе жандармаў,—расстралялі пад Грэнадай у жніўні 1936 года геніяльнага паэта, ворага рэакцыі і фашызма.

Мастацкая дзейнасць Гарсіа Лорка праявілася ва многіх галінах. Ён быў выдатным драматургам. У радзе яго п'ес асабліва вылучаецца трагедыя «Марыянна Пінеда», прысвечаная рэволюцыянерцы, пакаранай смерцю ў 1831 годзе, і народныя трагедыі страсцей «Крывавае вяселле» і «Йерма». «Крывавае вяселле» у гэтым годзе пастаўлена з вялікім поспехам у цыганскім тэатры «Ромэн» у Маскве, а таксама выйшла ў рускім перакладзе. Драматургія Гарсіа Лорка шматвобразная і своеасаблівая. Цудоўная фантазія штурхала паэта на ўсё новыя і новыя пошукі тэм, сюжэтаў, вобразаў і форм. Яго п'есы былі сустрэты перадавой Іспаніяй, як пачатак адраджэння іспанскай драматургіі і іспанскага тэатральнага мастацтва. На сцэнах іспанскіх тэатраў пераважалі п'есы, далёкія ад інтарэсаў народа і ад сапраўднага мастацтва. Гарсіа Лорка прынёс у літаратуру і ў тэатр сюжэты, узятыя з народнага жыцця, і напружанне вялікіх страсцей, авеяных дыханнем высокай паэзіі.

Гарсіа Лорка таксама арганізоўваў народныя спектаклі і музычныя фестывалі; пасля рэволюцыі 1931 года ён зрабіўся мастацкім кіраўніком перасоўнага студэнцкага тэатра «Ла Бэррака», які іграў п'есы класікаў у невялікіх гарадах і ў вёсках.

Паэт і драматург, ён быў разам з тым музыкантам і мастаком.

Гарсіа Лорка не толькі вывучаў багацейшы іспанскі фальклор і чэрпаў з скарбніцы народнай паэзіі матэрыял для сваёй каватарскай паэтычнай работы, але і актыўна прапагандыраваў народнае мастацтва: у прыватнасці, ён прымаў удзел у вечарах народнай мастацкай творчасці і з тонкім майстэрствам акампаніраваў на раялі славутай выканальніцы народных песень і танцаў Архентініце.

Іспанскі народ і перадавыя людзі ўсяго свету глыбока паважаюць памяць выдатнага паэта, чыя бліскучая дзейнасць была абарвана ворагамі культуры і прагрэсу ў самым яе росквіце. І лепшым помнікам Федэрыко Гарсіа Лорка будзе перамога іспанскага народа над фашысцкімі варварамі.

АБ РАБОЦЕ АРКЕСТРАЎ У КІНОТЭАТРАХ І ПАРКАХ

Рэдка зараз сустрэнеш кінотэатр, дзе-б перад пачаткам сеанса не іграў аркестр. Але як іграюць гэтыя аркестры і што яны выконваюць, аб гэтым варта пагаварыць. Віцебскі абласны аддзел мастацтваў арганізаваў праверку работы аркестраў. Праверка ўскрыла адсутнасць увагі да работы аркестраў як з боку трэста кінофікацыі, так і з боку саміх дырэктараў кінотэатраў.

Твар саміх аркестраў не акрэслены. У кінотэатры «1 мая» аркестр называюць джазам без усякіх на гэта падстаў.

Ні ў адным з кінотэатраў ля ўваходу няма праграмы выступленняў аркестра. Больш таго, у фае глядзельнай залы не называюць музычных нумараў, якія выконваюцца аркестрам. Гэтыя няўважлівыя адносіны да совецкага гледача павінны быць у корані знішчаны. Глядач хоча ведаць, калі ён ідзе ў кіно, не толькі карціну, якую ён будзе глядзець, але і музыку, якую будзе слухаць.

Падбор рэпертуару таксама выпадковы. Што ёсць у партфелі кіраўніка, тое і выконваецца. Запытайцеся ў віцебскага гледача, творы якіх кампазітараў ён ведае, праслухоўваючы аркестры ў кіно, і ён вам зможа назваць толькі творы Дунаеўскага і Покрас. А звычайна ён слухае розныя фокстроты, прычым аўтараў гэтых фокстротаў не ведае нават сам кіраўнік, бо запіс фокстротаў на ноты для аркестра робіцца ў большасці выпадкаў на слых з грамафонных пласцінак, прычым часта выпадковымі людзьмі.

Бясспрэчна, што пры такіх адносінах да справы гледачу нельга прывіць густу да музычных твораў. Такія адносіны да гледача—злачынства, і з гэтым злом трэба як мага хутчэй пакончыць.

Ні адзін з аркестраў не мае ў сваім рэпертуары твораў беларускіх кампазітараў. Праўда у гэтым вінаваты і самі кампазітары, у першую чаргу іх саюз.

Зараз, калі рэспубліка рыхтуецца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, неабходна папулярызіраваць творы беларускіх кампазітараў, пазнаёміць з іх творчасцю шырокія масы працоўных, а гэта можна рабіць і праз аркестры ў кіно.

Праведзеная пры Віцебскім абласным аддзеле мастацтваў нарада кіраўнікоў аркестраў і гаспадарнікаў прыняла к правядзенню ў жыццё арганізацыю тэматычных канцэртаў у кіно, прысвечаных як рэволюцыйным датам, так і паасобным кампазітарам.

Яшчэ больш недахопаў у рабоце аркестраў пры парках. Як правіла, аркестры ў парках падбіраюцца гаспадарнікамі па прынцыпу: каб было дзешавей. Аркестры іграюць неэрэпетыраваныя рэчы. Склад аркестраў надзвычай цякучы. Усё гэта — вынік няўважлівых адносін да музычнага мастацтва.

Неабходна, каб усе аддзелы мастацтваў і Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК аддалі належную ўвагу якасці выканання музычных твораў аркестрамі ў кінотэатрах і парках. Выганяць халтуру і прывіваць слухачу добры музычны густ, выхоўваць яго—вось задача аркестраў у кінотэатрах і парках.

Гр. МАКСІМАЎ.

г. Віцебск.

Новую пазыку сустрэлі з энтузіязмам

Паведамленне па радыё аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск другога года) работнікі Тэатра рускай драмы гор. Магілева сустрэлі з вялікім энтузіязмам. Не гледзячы на тое, што калектыў тэатра знаходзіцца ў адпачынку, пераважная большасць таварышоў з'явілася на мітынг, прысвечаны новай пазыцы. Пасля мітынга пачалася падпіска. З ліку 117 працуючых на пазыку падпісалася 100 чалавек на суму 22.480 рублёў. Астатнія 17 чалавек знаходзяцца па-за межамі Магілева і як толькі звернуцца з адпачынку, будуць таксама ахоплены падпіскай.

Не сумняваемся, што падпіскай на пазыку будзе ахоплен увесь калектыў на 100 процантаў месячнага заработка.

ШКОЛЬНІКАЎ.

Старшыня мясцкома тэатра.

**

Калектыў Белдзяржвыдавецтва налічвае 132 чалавекі. На новую пазыку падпісалася 128 чалавек на суму 50.240 рублёў. 4 чалавекі знаходзяцца ў адпачынку. Падпіска прадаўжаецца.

Клапатліва выхоўваць маладыя кадры літаратуры

НЕКАЛЬКІ ПАТРАБАВАННЯЎ

Кожны дзень у літаратуру ўваходзяць новыя імёны маладых і пачынаючых паэтаў, празаікаў, драматургаў і крытыкаў. Як-жа пастаўлена ў нас работа з маладымі пісьменнікамі?

Пакуль-што дрэнна. Кабінет маладога аўтара, у задачу якога ўваходзіць выхаванне здольнай літаратурнай моладзі, слаба спраўляецца з гэтай адказнай і ганаровай работай. Работнікі кабінета, за малым выключэннем (тт. Клімковіч і Мурашка), яшчэ не ведаюць, што пішуць, чым жывуць маладыя кадры літаратараў.

Часта творы пачынаючых даваліся на кансультацыю непісьменным літаратурным эскулапам (накшталт тав. Бялевіча), якія самі надзвычай павярхоўна разбіраюцца ў спецыфіцы мастацкай літаратуры і не здольны ўлавіць у творах, дасланых на кансультацыю, свежую, непасрэдную думку, вобраз, зварот, а падыходзяць да ацэнкі іх з вышыні птушынага палёту. Якая-ж карысць ад такой кансультацыі? Ніякай, акрамя шкоды.

Газета «Літаратура і мастацтва» недастаткова працуе з маладымі. Трэба проста сказаць, што тут у некаторай меры бытуе так-званы рангавы падыход да ацэнкі творчасці: за імем не бачаць жывых людзей.

Чым, як не няўважлівымі адносінамі да выхавання моладзі тлумачыцца факт, што на курсах маладых аўтараў не было ніводнага маладога драматурга. Ці-ж іх у нас няма?

Курсы-канферэнцыя маладых аўтараў пры праўленні ССПБ далі шмат карыснага маладым літаратарам, уваходзячым у літаратуру. Знаёмства з творчасцю лепшых прадстаўнікоў заходнееўрапейскай літаратуры, з класікамі рускай паэзіі і прозы, з творчасцю савецкіх пісьменнікаў значна пашырыла наш кругагляд. Вялікую карысць далі гутаркі аб сумежных відах мастацтва (скульптура, жывапіс, опера і інш.). Паездка на экскурсію ў Маскву — сэрца краіны Советаў — адно з лепшых мерапрыемстваў, праводзімых на курсах.

Хочацца, каб дапамога была яшчэ больш дзейснай, яшчэ больш жывой.

Маладыя літаратурныя сілы тэрытарыяльна адарваны ад Мінска. Абласныя камісіі ССПБ недастаткова працуюць у галіне выхавання маладых аўтараў. Гэты недахоп трэба ліквідаваць, і як мага хутчэй.

Чаму-б не ўнесці ў план работы праўлення ССПБ, секцый (празаікаў, паэтаў, драматургаў і крытыкаў) выклік лепшых прадстаўнікоў літаратурнай моладзі на свае пасяджэнні з мэтай разбору іх творчасці, з мэтай практычнай дапамогі.

Штодзённая сувязь (нават пісьмовая) значна дапаможа росту маладых аўтараў. Секцыя крытыкаў павінна даручаць маладым крытыкам даклады аб асобных кнігах, аб творчасці пісьменнікаў і заслухоўваць гэтыя даклады. Гэта мерапрыемства дапаможа іх творчаму росту.

Газета «Літаратура і мастацтва» павінна, на мой погляд, завесці тэматычны план да маладых аўтараў, даваць ім творчыя заданні.

Цесная сувязь, клопаты аб маладых кадрах літаратуры — вось ключ к выхаванню новых таленавітых пісьменнікаў.

Пав. ХАДАРЭНКА.

КУРСЫ МАЛАДЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ ЗАКОНЧЫЛІ РАБОТУ

9 жніўня ў Мінску закончылі работу курсы-канферэнцыя маладых аўтараў.

За месяц курсанты праслухалі рад лекцый і гутарак аб класічнай і сучаснай літаратуры. Маладыя аўтары сустрэліся з пісьменнікамі Коласам, Бядулям, Крапівой, Клімковічам, Чорным, Глебкам, з мастакамі Азгурам, Малкіным, з кампазітарам Шчэгловым, з мастацкім кіраўніком Ленінградскага тэатра імені Ленсовета Радлавым і іншымі.

Курсанты наведалі Гістарычны музей, домік першага з'езда РСДРП, праглядзелі спектаклі ў Ленінградскім тэатры імені Ленсовета, правялі творчыя абмеркаванні гэтых спектакляў.

Вялікае месца ў рабоце курсаў заняло абмеркаванне творчасці маладых пісьменнікаў.

9 жніўня курсанты выехалі ў Маскву для азнаямлення з Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкай і музеямі сталіцы.

Канст. КІРЭЕНКА

КАЛЯ САДА-ПАЛІСАДА

Каля сада-палісада
Праязджаў казак.
Неспакойна па дарозе
Танцаваў рысак.

Каля сада-палісада
Лёгкаю хадой
Ад ракі ішла дзяўчына
З ключавой вадой.

У дзяўчыны ручаямі
Дзве касы цякуць.
Спадабалася дзяўчына
Вельмі казаку.

Задрыжэлі ў хлопца рукі, —
Упалі павады,
Хоць асмяг за шлях—забыўся
Папрасіць вады.

У дзяўчыны слаўнай шчокі
Чырванню цвітуць.
Заглядзелася на хлопца,
Разліла ваду.

«Пачакай, галуба,—ціха
Пачынаў казак.—
Я хачу табе, галуба,
Пару слоў сказаць.

Пралягае на граніцу
Мой далёкі шлях.
Не адна з дзяўчат прыгожых
Прада мной прайшла.

Многа з цёплаю усмешкай
Паглядала ўслед.
Многа ў хату запрашала
Госцем на абед.

У палон не брала сэрца
Нічыя краса.
Каля сада-ж-палісада...
Эх, ды што казаць!

Сэрца—ў полымі. Па жылах
Бурна кроў бяжыць...
Ты скажы сваё, галуба,
Імя мне скажы!..»

— Што-ж паробіш, шэравокі,
З ласкавым табой.
А завуць мяне Аксанай.
Хай-жа кожны бой

Славай твой атрад пакрые.
А цяпер—бывай!..
Загуляў рысак пад хлопцам —
Паспрабуй, стрымай!

Па-за садам-палісадам
Знік даўно казак.
У дзяўчыны ў сэрцы радасць.
А ў вачах—сляза.

Гомель, 1939.

Іван МЕЛЕЖ

НАД РАКОЮ

Дзе свой тонкі стан каліна
Нахіліла над ракой,
Мы спаткаліся, дзяўчына,
Яснай летняй раніцой.
Спала ўсё. І нават вецер
Над вадою не хадзіў.
Пад густым альховым веццем
Вудзіў рыбу я адзін.
Ты прышла. Са смехам звонкім
Праплыла непадалёк.
Хваля біла ў бераг стромкі,
Утапіўшы паплавок.
Усю рыбу разагнала.
Я ўзлаваўся і пайшоў.
Ты-ж і заўтра жартавала
І мяне злавала зноў.
Так нязвычна я спаткаўся.
І над ціхаю ракой
Сам міжвольна захапляўся
Я вясёласцю тваёй.
Хмурыў бровы я злосліва.
Губы сціскваў. Толькі дзе!
Сумна стала мне маўкліва
З вудаю ў руцэ сядзець
І глядзець уважна ранкам,
Ці не клюнула... Вось так
На вясёласць — на прынаду —
Я папаўся, бы шчупак.
І тады адклаў вудзільна,
Падыйшоў я да цябе:
«Ну, вясёлая дзяўчына,
Пазнаёмімся цяпер!»
«На спачынак з інстытута
Я прыехала к бацькам.
Месяц з вамі тут пабуду,
Месяц буду шкодзіць вам.
І не злуйцеся. Усёроўна
І назаўтра я прыду».
Ранак ясны быў, чароўны,
Цёплы вецер з поўдня дзьмуў...
Вось і восень... На каліне
Ліст завянуў і пажоўк,
І з вясёлаю дзяўчынай
Час расстання надышоў.
Сумна з той пары мне стала.
Нудна ранкам. Эх, каб зноў
Нада мной ты жартавала
І шумела, як бывала,—
Разганяла шчупакоў!

Мінск, ліпень.

ТВОРЧЫЯ ВЕЧАРЫ—ШКОЛА МАЛАДОГА ПІСЬМЕННІКА

Курсы-канферэнцыя маладых аўтараў пры ССПБ далі нам не толькі дапамогу ў творчай працы, але практычна паказалі на недахопы, якія меў той ці іншы малады пісьменнік. Адным з такіх сродкаў дапамогі была арганізацыя творчых вечароў саміх курсантаў з удзелам старэйшых пісьменнікаў. Выступленні на гэтых творчых вечарах тт. Клімковіча, паэта-ордэнаносца П. Броўкі, Модэля, Р. Мурашкі, Мальцінскага, Лійўшыца і інш. дапамаглі многім з курсантаў правільна зразумець і асэнсаваць недахопы сваёй творчай працы.

Малады пісьменнік Іван Мурашка напісаў цікавую аповесць «Чорная лужа» аб гераічных подвігах беларускага народа ў барацьбе за сваё вызваленне ад белапалякаў. І трэба адзначыць, што крытычныя заўвагі курсантаў падказалі тав. Мурашку істотныя папраўкі, якія зробяць яго твор яшчэ больш цікавым, больш праўдзівым.

Актыўна абмяркоўваліся творы маладых паэтаў: Д. Кавалёва — «Ноч у тайзе», «Пчалавод», К. Кірэенка — «Сыноўняя песня», «Ты па шчавель ішла на луг», Б. Глікіна — «На часах», «Мир неделим», вершы аб дружбе, В. Місюна— «Шчасце знойдзенае», «Абрам». Разабраны творы маладых празаікаў тт. Вярхоўскага і Ткачова.

Усім гэтым таварышам старэйшыя пісьменнікі далі не мала заўваг і ўказанняў, указалі на асноўныя недахопы ў іх творчасці. Была звернута вялікая ўвага на неабходнасць далейшай упартай работы над словам.

Актыўны ўдзел у абмеркаванні твораў на вечарах прымалі самі курсанты. Заўсёды са змястоўнымі заўвагамі выступалі тт. Хадарэнка, Станкевіч, Гурылёў, Мележ, Глікін, Закс і інш.

Наогул трэба адзначыць, што творчыя вечары з'явіліся для нас вялікай школай. Пажадана было-б, каб праўленне ССПБ практыкавала ў далейшым перыядычныя выклікі пасобных здольных таварышоў для заслухоўвання іх творчых справаздач перад пісьменніцкім актывам. Гэта дасць маладым пісьменнікам вялікую карысць.

В. ХМЫЗ.

Леанід ГАЎРЫЛАЎ

АРЛЁНАК

Як вечар барвовыя промні
На вусны твае пакладзе—
Узрушана, страсна, няроўна
Запросіцца сэрца з грудзей.
Ні ў кога вачэй такіх сініх,
Глыбокіх і шчырых такіх
Не бачыў я.
Мы з табой сына
Прадбачым у марах сваіх.
Не ўмеючы, голасам тонкім
Я ў лад нашым думкам пяю,
Я песню пяю пра арлёнка,
Любімую песню тваю.
—Арлёнак, арлёнак...
І сніцца
Шырокага стэпу кавыль.
Між волі апусціш расніцы,
Баёў прыгадаючы быль.
—Арлёнак, арлёнак...
І сніцца—
Над пожнямі месяц плыве,
Шумяць у калінах крыніцы,
Радзімыя месцы твае.
У туманах, у замеці, дыме
Ты свой пачынаючы шлях,
Басонаж, мяжамі крутымі,
Па чорным пажарышчы йшла.
Арлёнак над полем высока
У быстрым палёце кружыў,
І сонца паліла навокал,
І свет залаціўся і жыў.
А ты йшла малой сіратою,
Кусаючы губы, ў слязах...
Ты стала харошай дачкою
Атрада байцоў-партызан.
І скрозь несціхана ты пела
Нямудрую песню сваю.
...У тваіх мазалях агрубелых
Я ласку тваю пазнаю.
Як вечар гарачыя промні
На вусны твае пакладзе—
Узрушана, страсна, няроўна
Запросіцца сэрца з грудзей.
Я ўпэўнен: і нівам, і травам
Цвітучым багаццем расці.
Арлёнак—наш сын кучаравы—
Наследуе іх у жыцці.

Д. КАВАЛЁЎ

НА ЛУЗЕ

Пагас паволыда летні дзень.
Вільготны змрок лугі адзеў.
Паплыў над зорнаю ракой
Напрэты пар. Вакол—спакой.

На мурагу каля ракі
Вячэру вараць рыбакі.
Ад іхніх постацей ляглі
Даўгія цені на зямлі.

Нізамі па траве балотнай
Ноч сцеле белыя палотны.
І маладзік, такі высокі,
У густых заблытаўся асоках.
І коні блукаюць далёка...

У свежым сене да зары
Паснулі моцна касары.
Вакол духмяныя, сухія
Стаяць стагі, бы вартавыя.



«Абед у калгасе» — эскіз карціны маст. Даўгяла для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Фота І. Капліпскага.

Анат. ФІНКЕВІЧ

БОТЫ

Вясёлы ішоў дзед Мацей на рэчку.

І праўда, чаго яму сумаваць? Хлеба на працадні атрымаў даволі—семдзесят пудоў; хата добрая, двое свіней і чацвёра парасят ёсць. Сыны часценька грошай падсылаюць. Жыве ён са сваёй бабкай Яўхім'яй і гора не знае. Вось толькі бяда—ніяк дзед к ботам прызвычаіцца не можа. То ціснуць, то цяжкія, то нязручна ў іх, а ў лапцях — і нагу не ціснe, і лёгка, і мякка. Карацей кажучы, не любіў дзед ботаў. З валёнкамі яшчэ сяк-так мірыўся. Яны і сапраўды маюць перавагу не толькі над ботамі, але нават і над лапцямі...

— Лёгкія, цёплыя, а каб яшчэ не працякалі ў вадзе, тады і зусім добра было-б...

Ішоў дзед на рэчку луцце на лапці драць.

Не любіла такога занятку Мацеева жонка. «Дзве пары ботаў, а ён лазу драць ідзе. Макаўка ў цябе, Мацей, а не галава». Як навaліцца Яўхім'я,—хоць на неба лезь. Але старога чалавека цяжка перакапаць, ён сваё ведае: у лапцях зручней, хай што хочуць гавораць...

Мацей спыніўся на беразе Прыпяці. Выбраўшы добры лазовы куст, залез у яго, пачаў луцце драць. За шматгадовае жыццё прызвычаіўся ён да такой работы. У правай руцэ лоўка хадзіў нож, левай нагінаў лазняк, і гатовае луцце здавальняла і радавала дзеда.

«Ах, і важнецкае-ж луцце! Хоць на продаж нясі! Але хто захоча купляць, калі ў кожнага боты, і не абы якія— хромавыя, а дзяўчаты, бач ты іх, нават нейкія мадзістыя, на высокіх каблуках туфлі носяць? Іш, паненкі, у шаўковых хустачках, кофтачках баціставых, а плацці—не іначай, як шарсцяныя. Шкада, што стары, а то, таго і глядзі,—гатоў ушчыпнуць каторую... Эх, прайшлі годы маладосці. Вёска, панскі двор, рэчка, лазняк, лапці, лапці...

І старому прыпомнілася:

Аднаго разу (даўно было гэта) сказалі Мацею вычысціць каміны ў панскім доме. Раніцою другога дня пайшоў ён на кухню агледаць печ. Зайшоў і— хлюп-хлюп—мокрымі лапцямі па чыстай падлозе. Ходзіць быццам па вуліцы. Убачыла гэта пакаёўка Агапа (прыгожая была дзяўчына,—абы якіх пан да сябе не браў), ды як залямантуе:

—Што-ж ты нарабіў, што нарабіў?

Мацей аж здрыгануўся. Ясныя вочы і хараство Агапы даўно паланілі яго, і раптам на!—такая нядобрая сустрэча!

Мацей зірнуў на Агапу. Вочы яе пылалі.

Мацей апусціў вочы і падаўся пад дзверы хацеў хутчэй выйсці, выбегчы адсюль. Але, як на ліха, на левай назе разбарсалася абора. Правай Мацей наступіў на яе і, шырока ўзмахнуўшы рукамі, пахіснуўся, а рукавом зачапіўся за любімую панам статуэтку «Венеры». Разам з ёю ўпаў на падлогу. У вачах замітусілася,—здавалася, усё кудысьці ляціць...

Мацей устаў з падлогі. За статуэтку пан не даруе—гэта вядома. Адзін ратунак—не трапіць на самую злосць, бегчы, бегчы,—уцякаць. Мацей выскачыў на двор, агародамі пусціўся бегчы пад лес... Але, як на тое ішло, пан заўважыў учыненую Мацеем шкоду.

—Спусціць сабак!—закрычаў ён.

...Вялізныя, страшныя сабакі здагналі Мацея, накінуліся на яго—кусалі, на шматкі ірвалі вопратку, вырывалі мяса...

Заелі-б наглыя догі Мацея, на кавалкі парвалі-б, каб не адагналі сабак праезджыя людзі...

«—Лапці! Гэта праз лапці ўсё!»

Мацей не заўважыў, як пакінуў драць луцце. Блізка пачуліся крокі. Дзед азірнуўся. Берагам, з гармоняй за плячыма, не спяшаючыся ішоў культработнік Тарасікаў.

—Дзень добры! —прывітаўся ён. — Лыкі дзерыцё? — І пасміхаючыся, весела напяваючы, пайшоў далей.

Дзед скамячыў надраную лазу і злосна шпурнуў у рэчку.

...Не даходзячы да вёскі, Мацей гукнуў хлопчыка, сына суседа Макара, і загадаў:

—Бяжы да бабкі Яўхім'і, скажы, хай боты нясе, бо босы, скажы, Мацей у вёску не пойдзе. Ну бяжы-ж, толькі хуценька. Табе бабка і цукерачку дасць, а я хутка к сынам у Маскву паеду —абавязкова табе падарунак прывязу.

Х. ГУРЭВІЧ

Я—ДАЧКА...

(З тунгускіх народных матываў)

Я—дачка старога рыбака.
За мяне не знойдзеш прыгажэй.
Гоніць ветразі Іртыш-рака.
Мілы едзе... Пабягу хутчэй...
Калі хвалі сціхнуць, згубяць сілы
І фазан узнімецца ў прасторы,
Буду ведаць: мне не здрадзіў мілы
І кахае шчыра, як і ўчора.
Калі пырснуць злоснай пенай хвалі
І фазан сюды направіць крылы:
Пэўна вочы іншай чаравалі,
Пэўна, што другая пакарыла.
Дар-пярсцёнак я прыцісну к сэрцу
І у хвалі выкіну з слязою.
Пакуль ветразь к берагу прыб'ецца,
Задушуся доўгаю касою.

З яўрэйскай мовы пераклаў
П. ПАНЧАНКА.

Праф. М. Н. Дабрынін

ДА ПЫТАННЯ АБ СТВАРЭННІ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Беларускі народ мае сваю багатую літаратуру, значыць—павінна быць і гісторыя беларускай літаратуры. Стварэнне такой гісторыі—справа неадкладная і маючая дзяржаўнае значэнне. Збіраючыся ствараць гісторыю беларускай літаратуры, мы перш за ўсё павінны звярнуцца да гістарычных даных, матэрыялаў і вырашыць першае асноўнае пытанне аб яе храналогіі, аб яе пачатку. На самай справе, з якога часу можам мы гаварыць аб гісторыі беларускай літаратуры?

Пытанне аб пачатковым перыядзе беларускай і украінскай літаратур узнімалася ўжо не адзін раз і на яго былі дадзены больш ці менш аргументыраваныя адказы. Напамінаю некаторыя з іх.

IV том гісторыі рускай этнаграфіі акадэмік А. Н. Пыпін прысвяціў Беларусі і Сібіры. («История русской этнографии». Том IV. Белоруссия и Сибирь. СПБ. 1892). Тут ён закранае пытанне, якое цікавіць нас.

«Асновай беларускага племені (мы-б сказалі—народа) і говару (мы-б сказалі—мовы) былі тыя старыя плямёны, якія сядзелі на паўночным захадзе старажытнай Русі: крывічы, дрыгвічы і інш., і ў асаблівасці першыя, галоўнымі пунктамі якіх былі Полацк, Ізборск, Смаленск, але якія, разам з тым, з вельмі старадаўняга часу распаўсюджваліся і далей на ўсход, спрыяючы рускай каланізацыі басейна Окі і верхняй Волгі, дзе потым атрымала перавагу племя вялікарускае. Такім чынам, з аднаго боку, плямёны заходняга края ўдзельнічалі сваімі парасткамі ў стварэнні самога племені вялікарускага; з другога, застаючыся на месцы, захавалі і развівалі асобна свае першапачатковыя мясцовыя асаблівасці».

Вось гэтыя мясцовыя племянныя асаблівасці, у сілу знешніх палітычных прычын, як, напрыклад, татарскае і літоўскае нашэсце, умацоўваліся і развіваліся замест таго, каб сцірацца ў зносінах з іншымі кроўнымі часцямі. «Адрозненні рускай поўначы і поўдня па мове адносяць цяпер, у асобных выпадках, яшчэ да XI стагоддзя, і калі ўявіць сабе, што аб гэтай рускай мове XI стагоддзя мы маем толькі вельмі няпоўныя сведчанні, дык можна падумаць, што дыялектычныя адрозненні былі больш абшырныя, чым нам цяпер вядома». Усе пазнейшыя ўплывы ў беларускай пісьменнасці не адыгрываюць рашаючай ролі ў стварэнні беларускай мовы.

«Такім чынам, беларуская мова ці говар не паходзіць ад вялікарускай, а развіваецца адначасова з ёй з блізка кроўных, але асобных племянных элементаў і ў вельмі розных палітычных і бытавых абставінах». (Пыпін. Там-жа, стар. 6).

Развіццё беларускай мовы на аснове племянных асаблівасцей у своеасаблівых гістарычных умовах акадэмік Пыпін адносіць да сярэдняй эпохі, калі руская поўнач была аддзелена ад рускага захаду і поўдня, г. зн. да перыяду татарскага іга XIII—XIV стагоддзяў. З прычыны татарскага іга аб'ядноўчая тэндэнцыя не змагла перамагчы ў XIII стагоддзі, а прайшла доўгі шлях барацьбы, збірання рускіх зямель і сіл, звяржэння іга і далучэння кроўных частак у XVII і XVIII стагоддзях.

Праца А. Н. Пыпіна выйшла ў 1892 годзе, а ў 1904 годзе з'явілася першая кніга праф. Е. Ф. Карскага «Белоруссы». Раздзел III гэтай працы носіць назву «Мова рускіх плямён, якія насялялі беларускую тэрыторыю ў старажытныя часы. Зараджэнне беларускіх асаблівасцей. Старэйшыя слоўныя запазычанні—у фінаў і іранцаў». Даследуючы развіццё гукавых асаблівасцей беларускай мовы, Е. Ф. Карскі прыходзіць да вываду: «Аказваецца, што ўсе галоўнейшыя асаблівасці сучасных беларускіх говараў у большай ці меншай ступені скlaліся не пазней XIII стагоддзя. У большасці асаблівасці беларускага говару з'яўляюцца прамым пасьбітам агульных рускіх рысаў» (Карскі. «Белоруссы», том I, стар. 105, Вільня, 1904 год). Канчатковую выпрацоўку асаблівасцей беларускай мовы Карскі адносіць да часу літоўскага ўладарства, г. зн. да XIII і ў асаблівасці да XIV стагоддзя. «Пры такіх спрыяючых умовах (мірнае культурнае развіццё, свабоднае ад татарскай залежнасці, перавага рускіх над літоўцамі ў духоўных (мы-б сказалі ў культурных.—М. Д.) адносінах, прызнанне рускай мовы афіцыяльнай дзяржаўнай мовай) адбылося аб'яднанне ўсіх заходнерускіх плямён і выпрацоўка адной агульнай мовы. З гэтага часу кладзецца моцны пачатак той рускай народнасці, якая вядома да гэтага часу пад назвай беларускай. Самая мова яе, ужо ўпаўне склаўшаяся к гэтаму часу ў галоўных асаблівасцях, можа быць названа беларускай». (Е. Карскі. Там-жа, стар. 114). І далей: «Такім чынам пачатак літоўскага панавання ў заходнерускіх абласцях можа быць ахарактарызаваны, як перыяд стварэння беларускай народнасці і яе мовы». (Там-жа, стар. 114).

Калі гэты вывад прымаць як храналагічную датыроўку, дык з ім згадзіцца можна, калі-ж разумець яго ў тым сэнсе, што стварэнню беларускай мовы дапамагала літоўскае ўладарства, дык гэта—няправільна. На самай справе, становіцца незразумелым, як адсталы ў культурных адносінах народ мог удзячна ўплываць на стварэнне мовы ў народа, больш развітага ў культурных адносінах.

Хутчэй трэба думаць, што палітычнае панаванне Літвы над Беларуссю выклікала тэндэнцыю да аб'яднання, да згуртавання ў адно цэлае з Расіяй і такім чынам супроцьстаяла іншаземнаму панаванню. Цяга да адзінства можа быць устаноўлена на працягу ўсяго часу раздзельнага існавання Расіі, Украіны і Беларусі.

Да пытання аб пачатковым перыядзе рускай, беларускай і украінскай літаратур падышоў акадэмік В. М. Істрын у працы «Исследования в области древне-русской литературы» (1906 год) і потым у «Очерке истории древне-русской литературы» (Петраград. 1922 год). Да думкі Істрына далучыўся В. Н. Перэц у працы «Краткий очерк методологии истории русской литературы» (Петраград, 1922 год). Думка Істрына па гэтаму пытанню зводзіцца да наступнага: «У першы перыяд, дамаскоўскі, літаратура насіла характар агульнарускі і можа быць названа «агульнарускай» літаратурай. Такая яе назва грунтуецца, перш за ўсё, на яе геаграфічным распаўсюджанні. З адзінствам літаратуры ў сэнсе геаграфічнага распаўсюджання звязваецца яе адзінства і яе адсутнасці ў перыяд XI — XIII стагоддзяў. У гэты-ж перыяд няма яшчэ ні вялікарусаў, ні маларусаў, ні беларусаў, а ёсць толькі адзін «рускі» народ, які хоць і насіў у сабе зародак пазнейшага свайго раздзялення на тры плямёны, але яшчэ ў вельмі недастатковай ступені, каб яны маглі даць падставу для поўнага падраздзялення. І з гэтага боку літаратура XI— XIII стагоддзяў не была ні вялікарускай, ні маларускай, ні беларускай, а была літаратурай «агульнарускай», ці, дакладней, проста «рускай». (В. Істрын. «Очерк истории древнерусской литературы», П. 1922, стар. 5).

Таксама абстаіць справа і з мовай. Асаблівасці, якія адрозніваюць мовы рускую, украінскую і беларускую, сталі прыкметнымі ўжо ў XI— XIII стагоддзях, але развіліся значна пазней, літаратурная-ж мова была адзінай для поўдня, паўночнага ўсходу і захаду, «значыць і з гэтага боку літаратура XI—XIII стагоддзяў была літаратурай «агульнарускай». (Там-жа, стар. 6). XIV стагоддзе В. М. Істрын лічыць пераходным, а XV—XVII стагоддзі—перыядам маскоўскім. З XIV стагоддзя адбываецца раздзяленне адзінай рускай літаратуры і мовы на тры: рускую, украінскую і беларускую, прычым Істрын мяркуе, што літаратура маскоўская «з'яўляецца непасрэднай прадаўжальніцай» агульнарускай літаратуры XI—XIII стагоддзяў. Ён мяркуе, што традыцыі старарускай літаратуры кіеўскага перыяду прадаўжаліся толькі на паўночным усходзе, што літаратура паўднёваруская (г. зн. украінская) і заходнеруская (г. зн. беларуская) не маюць цеснай духоўнай сувязі з літаратурай старажытнага перыяду (XI—XIII стагоддзяў). З апошнім сцвярджэннем мы згадзіцца ніяк не можам, бо яно супярэчыць фактам гісторыі.

Развіццё народа і яго духоўнае жыццё ішлі бесперапынна, культура і літаратура украінскага і беларускага народаў мела сваёй асновай культуру старажытнага перыяду, у гэтых адносінах яны нічым не адрозніваліся ад літаратуры маскоўскай.

Ідэя адзінства «зямлі рускай» была асноўнай не толькі ў XI—XII стагоддзях, але і ў наступны час была ярка выражана ў літаратурах маскоўскай, украінскай і беларускай. У літаратуры маскоўскай гэта была ідэя сувязі з роднымі народамі, а ў украінскай і беларускай — цяга да роднага рускага народа, які перамог хутчэй за іншых цяжкасці гістарычных выпрабаванняў і адстаяў сваю самастойнасць і незалежнасць. З канчатковым вывадам Істрына таксама згадзіцца нельга, бо ён сцвярджае, што літаратуры украінская і беларуская ўваходзяць у літаратуру «агульнарускую» ў XVIII—XIX стагоддзях, але як непасрэднае прадаўжэнне літаратуры маскоўскай (XIV—XVII стагоддзі). Такім чынам для украінскай і беларускай літаратуры як-бы прападае перыяд з XIV па XVIII стагоддзе, што, вядома, супярэчыць фактам гістарычным.

Разыйшоўшыся ў сілу гістарычных умоў шляхі развіцця трох народаў, сапраўды, сышліся зноў, але ў сям'і савецкіх народаў. Настаў савецкі перыяд у развіцці нацыянальных літаратур, які характарызуецца сацыялістычным зместам у нацыянальнай форме і развіццём у бок зліяння ў будучым у адну сацыялістычную культуру з адзінай мовай.

Разважаючы ў гэтым плане, цікава прыгадаць думку тых гісторыкаў літаратуры, якія ішлі ў гэтым напрамку. Так, вельмі цікава на гэту тэму разважаў акадэмік П. Н. Сакулін. «Мяркую, што паколькі гутарка ідзе аб развіцці ўласнарускай (вялікарускай) літаратуры, ніхто не будзе адмаўляць прынцыповай важнасці адзначаць кропкі яе датыкання з літаратурамі украінскай і беларускай. Але гутарка можа ісці аб большым.

Украіна і Беларусь маюць свае літаратуры (як і свае мовы). У наш час (пісана ў 1925 годзе — М. Д.) «самастойнасць» цэніцца асабліва высока. Можна не сумнявацца, што ў новых палітычных умовах украінская і беларуская літаратуры ўзмацнеюць і будуць быстра развівацца. Гісторыя даўно раздзяліла тры вялікія галіны; цяпер кожная з іх рада магчымасці разгарнуць на ўсю шырыню свае творчыя сілы. Але гісторыя-ж у нашы дні і збліжае кроўныя галіны; цяпер без усякай прымесі злых пачуццяў, братняй мовай можна гаварыць аб адзіным ствале, з якога пайшлі гэтыя галінкі. І не праздная з'явіцца спроба, можа быць, нават у бліжэйшым будучым

Творчасць Максіма Багдановіча

М. ЛАРЧАНКА

Першыя творы Максіма Багдановіча паявіліся ў друку ў 1908 годзе. З 1908 па 1917 год паэтам напісана значная колькасць лірычных вершаў, паэм, песень, апавяданняў, многа публіцыстычных артыкулаў і рэцэнзій па пытаннях літаратуры, мастацтва, музыкі, гісторыі і культуры. Пры жыцці паэта з друку выйшла толькі адна кніга яго вершаў—«Вянок» (Вільна, 1913 год). У нашы часы Акадэміяй навук БССР выдадзен поўны збор твораў М. Багдановіча ў двух томах.

Буйны мастак, М. Багдановіч займае пачэснае месца ў гісторыі беларускай літаратуры. Валодаючы вялікай мастацкай культурай, паэт здолеў у радзе высокапаэтычных твораў праўдзіва адлюстраваць некаторыя бакі тагочаснай рэчаіснасці і даць узоры сапраўднай паэтычнай культуры.

М. Багдановіч пераважна быў сімвалістам. Эстэтычныя-ж погляды яго былі супярэчлівыя. Прытрымліваючыся эстэтыкі сімвалізма, ён у сваёй літаратурнай практыцы часта адступаў ад эстэтычных прынцыпаў гэтай плыні і станавіўся на пазіцыі рэалізма.

Літаратурна-эстэтычныя погляды М. Багдановіча ярка выкладзены ў некаторых яго мастацкіх творах і ў радзе крытычных артыкулаў. Так, у празаічным творы «Апокрыф» паэтам сцвярджаецца, што паэзія ўзвышаецца над жыццём і не залежыць ад яго. У «Апокрыфе» думка паэта аб аўтаномнасці мастацтва і незалежнасці яго ад жыцця ўкладаецца ў вусны гаспадара-эстэта, прыхільніка чыстага мастацтва, які сцвярджае: «Я-ж гавару вам, добра быць коласам; але шчаслівы той, каму давялося быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў».

У многіх творах М. Багдановіча, асабліва ў філасофскай і інтымнай лірыцы, мы знаходзім матывы песімізма, адзіноты.

«Над зямлёю імгла, у душы пустата».

Душэўны стан паэта, абкружаючая яго абстаноўка паказваюцца як нешта незвычайнае і таямнічае. Лірычны вобраз самога паэта і сродкі яго выражэння вытрыманы ў плане сімвалісцкай паэтыкі, у плане таямнічых намёкаў на нешта незвычайнае, містычнае.

У вершы «Хаўтуры» Багдановіч пісаў:

Так таінсцвенна ўсё, так знаёма,
Ўсё так проста і так неразгадана.

Рэальнае жыццё, па думцы Багдановіча, уяўляе сабой нейкае зачараванае кола, з якога няма ніякага выйсця, апрача «краіны забыцця», а смерць з'яўляецца нібыта пачаткам нейкага новага, невядомага жыцця:

Быць можа, пуціна жыцця
Лягла пярсцёнкам, друг,
І я ў краіне забыцця
Не раз раджаўся, як дзіця,
Прайшоўшы пэўны круг.

У зборніку «Вянок» М. Багдановіча мавят ёсць асобны цыкл вершаў, які называецца «Каханне і смерць».

Не знайсці мне спакою ні цёмнаю ноччу, ні днём,
Бо любоў мяне мучыць і паліць пякельным агнём...
. . . .
Пэўна прыдзецца мне пахавацца ў сырую зямлю,
Каб уцешыць мучэнні і тую забыць, што люблю.

У плане змрочнага трагізма і хваравітых перажыванняў вытрыманы і такія лірычныя вершы, як «Праклянце вагітнай», «Учора шчасце глянула нясмела» і інш.

Лірыка прыроды непасрэдна звязана з лірыкай інтымных перажыванняў. Своеасаблівасць пейзажнай лірыкі паэта заключаецца ў тым, што прырода малюецца ў двух планах: рамантычным і рэалістычным.

У вершы «Лясун» даецца пейзажная замалёўка цёмнай пушчы і на фоне пушчы выступае вобраз лясуна. Рэальны фон прыроды лірычнай канцоўкай верша як-бы знімаецца, знікае «як дым, як вада», і застаецца таямнічы міраж лясуна, рэальнае як-бы служыць своеасаблівым трамплінам для пераходу «у нязнаны свет».

Такім-жа падыходам да апісання з'яў прыроды вызначаюцца і лірычныя творы Багдановіча: «Старасць», «Дзесь у хмарах жывуць павукі», «Панурая вялізная жывёла».

Падкрэсленая метафарычнасць з'яўляецца характэрнай асаблівасцю паэтычнай мовы сімвалічных вершаў Багдановіча. Так, у творы «Над возерам» вячэрні туман параўноўваецца з рыбацкімі сецямі, якія месяц цягне з зямлі на неба. У вершы «Бура» хмары даюцца ў выглядзе вялізнай панурай жывёлы, а дождж—у выглядзе «халодных бічоў крыві», якія спякаюць з неба на зямлю.

На першы погляд можа здацца, што такія разгорнутыя метафары з'яўляюцца вельмі рэалістычнымі, бо тут у кожным слове прысутнічаюць матэрыяльныя паняцці; аднак, незвычайныя метафары і параўнанні: «хмара—вялізная жывёла», «дождж — слізкі павук» — затушоўваюць канкрэтныя вобразы прыроды. Такім чынам, нават матэрыяльная канкрэтнасць мастацкіх сродкаў у сімвалісцкай паэзіі з'яўляецца сродкам стварэння атмасферы незвычайнасці, таямнічасці.

Соцыяльныя прычыны песімізма Багдановіча захаваны ў той рэчаіснасці, у якой давялося жыць чуламу і таленавітаму паэту. Высокаадукаваны, гуманна настроены інтэлігент, выхадзец з дробнабуржуазнага асяроддзя, ён блізка стаяў да жыцця працоўных. Паэт бачыў соцыяльны і нацыянальны прыгнёт, пад цяжарам якога знаходзіліся працоўныя масы беларускага народа. Адмоўна ставячыся да змрочнай царскай рэчаіснасці, але не здольны ўзняцца да актыўнай барацьбы з гэтай рэчаіснасцю, паэт не бачыў сапраўдных і канкрэтных шляхоў вызвалення працоўных мас. Адсюль вынікаюць упадніцка-пісімістычныя, хваравітыя настроі, уласцівыя некаторым яго лірычным вершам.

Указваючы на гэтыя настроі і матывы песімізма, адзіноты, тугі, уласцівыя многім вершам паэзіі Багдановіча, мы павінны падкрэсліць, што яны ў творчасці паэта не з'яўляюцца асноўнымі.

Разам з журботнымі і тужлівымі нотамі ў Багдановіча даволі моцна гучаць аптымістычныя матывы, якія сцвярджаюць жыццё і яго радасці.

Часта адступаючы ад сімвалізма, Багдановіч узнімаўся да рэалістычнага паказу прыроды, яе хараства. Паэт любіў прыроду. Яму ўласціва тонкае адчуванне і разуменне прыроды. Прырода ў рэалістычных вершах Багдановіча рознастайная і багатая, поўная жыцця і чароўнай прыгожасці. Пейзаж Багдановіча раскрываецца ў цеснай сувязі з настроямі, думамі і душэўнымі перажываннямі паэта. Гэта асабліва ярка праяўляецца ў такіх вершах Багдановіча, як «Прывет табе, жыццё на волі», «Блішчыць у небе зор пасеў», «Цёплы вечар, ціхі вечар», «Зімовая дарога», «Зіма», «Перад паводкай» і інш.

У вершы «Зімовы вечар» рэалістычны малюнак зімы напісан з крыштальнай яснасцю і паэтычнай чоткасцю. Майстэрскі падбор алітэрацый і асанансаў выпукляе пейзажны вобраз марознага звонкага вечара:

Здароў, марозны, звонкі вечар,
Здароў, скрыпучы, мяккі снег.
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.
Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

У лірычным творы «Перад паводкай» паэтам ствараецца яркі вобраз вясновай паводкі:

Праясняецца пагода,
Бо вярнулася вясна.
Ўсе чакаем, што прырода
Устрапянецца ада сна.
І пад птушак крык і гоман,
Даўшы хвалям вольны ход,
Прыпадніме бацька Нёман
На хрыбце магутны лёд.

Гэты верш мастацкай канкрэтнасцю сваіх вобразаў, яркасцю, прастатой і выразнасцю мовы і рытму нагадвае лепшыя вершы з пейзажнай лірыкі народнага паэта БССР Якуба Коласа.

Прыведзеныя прыклады сведчаць аб тым, што ў пейзажнай лірыцы Багдановіча рэалістычныя карціны займаюць даволі вялікае месца.

У апошнія годы сваёй творчай дзейнасці (1913—1917) М. Багдановіч аддаваў перавагу тэмам грамадскага характару. Ён з горыччу гаворыць аб цяжкай долі беларускай вёскі і беднага селяніна, стварае яркія малюнкі соцыяльнага жыцця працоўных мас Беларусі («Доля мужыка», «Мае песні»).

Ты скажы мне, мужык,
Як да долі ты звык,
Цёмна ў хатцы тваёй,
Плесня з мохам на ёй,
І адрынка твая
Збудавана з гнілля.

А ў вершы «Край мой родны» (1909 г.) даецца глыбока-праўдзівая карціна сялянскага жыцця ва ўмовах капіталізма:

Поруч раскідаліс родныя вёскі.
Жалем сціскаюцца грудзі.—
Бедныя хаткі, тапалі, бярозкі,
Ўсюды панурыя людзі...
Шмат што зрабілі іх чорныя рукі,
Вынеслі моцныя спіны;
Шмат іх прымусілі выцярпець мукі
Пушчы, разлогі, нізіны.
Кінь толькі вокам да гэтага люду —
Сціснецца сэрца ад болю,
Столькі пабачыш ты гора ўсюды,
Столькі нуды без паталі.

У вершы «Межы» (1914 г.) паэт стварае хвалюючы па сваёй мастацкай сіле малюнак паднявольнай працы і жабрацтва працоўных мас ва ўмовах страшэннага прыгнёту. Рукамі працоўнага чалавека,— заяўляе паэт,—створаны «усе багацтвы на зямлі», а сам ён мусіць жыць у беднаце і голадзе, ва ўмовах соцыяльнага і нацыянальнага ўціску.

Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы,
А людзі нішчацца у голадзе, у зморы
Ад беднаты, ад цемнаты,
Бо скрозь — мяжы, бо скрозь—платы.

Ёсць у Багдановіча некалькі вершаў («Я хлеба ў багатых прасіў і маліў», «Вы, панове, пазіраеце далёка», «Пан і мужык», «Слуцкія ткачыхі» і інш.), у якіх паэт спрабуе паказаць класавыя супярэчнасці між багатымі і беднымі. У вершы «Пан і мужык» селянін, усвядоміўшы сваю сілу, іранічна гаворыць пану:

Дзякуй, пане, бо пазнаў ад вас і я—
Не на трох кітах трымаецца зямля.
Згода, згода, бо здаецца неяк мне,
Што стаіць яна на нашай-жа спіне.

А ў вершы «Я хлеба ў багатых прасіў і маліў» даецца вобраз вялізнай сцяны з каменняў, якая вырасла паміж багатымі і беднымі і раздзяляе людзей на два процілеглыя варожыя лагеры. Паэт прадчувае, што гэта сцяна павінна рухнуць і пахаваць пад сабой прыгнятальнікаў.

Я хлеба ў багатых прасіў і маліў, —
Яны-ж мне каменні давалі;
І тыя каменні між імі і мной
Сцяною вялізнаю ўсталі.
Яна усё вышай і вышай расце,
І шмат каго дужа лякае.
Што-ж будзе, як дрогне, як рухне яна.
Каго пад сабой пахавае?

Багдановіч любіў сваю краіну, верыў у сілы народа і прыход лепшай будучыні.

Паэт быў упэўнен, што беларускі народ дачакаецца вызвалення з-пад гнёту царызма:

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага яснага дня.

Паглядзі, як усход разгараецца,
Колькі ў хмарах залётных агня...

Але ў Багдановіча часамі сустракаюцца вершы («Пагоня», «Досі ўжо, браты, чужынцам мы служылі»), у якіх прарываюцца нацыяналістычныя ноткі; аднак, не яны характарызуюць паэта.

***

Паэтычныя вобразы, слоўна-мастацкія сродкі (метафары, эпітэты, параўнанні і г. д.) рэалістычных вершаў М. Багдановіча характарызуюцца, як відаць з усіх прыведзеных прыкладаў, яркасцю, каларытнасцю і прастатой. Выяўленчыя паэтычныя сродкі Багдановіча па-народнаму простыя і сакавітыя, яркія і жыццёвыя.

М. Багдановіч у цэнтры сваёй увагі ставіў музыкальную вобразнасць мовы. Ён быў майстрам-віртуозам у галіне гукавай апрацоўкі вершаў. Пісьменнік старанна і з майстэрствам рэалізаваў, асабліва ў прыродаапісальных творах, верленаўскі прынцып: «музыкі, музыкі, перш за ўсё».

Багдановіч адным з першых у беларускай літаратуры шырока прымяніў у сваёй паэзіі гукапіс, як сродак яркай выяўленчасці, стараючы разгорнутыя музыкальныя вобразы, асабліва пры паказе прыроды. Так, у вершы «Добрай ночы, зара-заранiца» паэт падбірае гукі такім чынам, што яны ў значнай меры дапамагаюць вырашыць тэму:

Добрай ночы, зара-заранiца.
Ужо імгла над зямлёю лажыцца.
Чорнай рызай усё пакрывае,
Пылам зор небасхіл абсявае,
Цішыня агартае мне душу.

Гэты верш нагадвае па сваёй мастацкай апрацоўцы верш Бальманта «Камыши».

Больш яскрава гэты прынцып слоўна-музычнай вобразнасці праяўляецца ў вершы Багдановіча «Завіруха». Тут паэт своеасаблівым падборам слоў і гукаў паказвае з'яву прыроды — завіруху, выкарыстоўваючы для гэтага алітэрацыю і асананс:

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе,
І спеў ліецца ўсё мацней,—
Гулянку справіў пан Падвей.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.


Багдановіч любіў вусную народную творчасць і як паэт выкарыстоўваў яе невычарпальныя багацці ў сваёй творчасці. Багдановіч ведаў сусветныя творы вуснай народнай творчасці і высока цаніў іх.

У духу народна-гераічнага эпаса Багдановіч рысуе нам алегарычны вобраз «Страцім-Лебедзя», як сімвал дужасці, смеласці і адвагі:

Страцім-Лебедзь—горды, моцны птах,
Яго звычаі—арліныя,
Яго ўцехі——сакаліныя;
Пер'і-пер'ячкі бялеюцца,
Бы на золку агнявеюцца.
Ў яго крылле—трыста тры пяры:
Узмахне крылом—быццам бор шуміць,
Узмахне другім—што мяцель шуміць.

Апрача беларускага фальклору, Багдановіч старанна апрацоўваў і выкарыстоўваў вусную народную творчасць іншых народаў. Выключнымі па сваёй паэтычнай апрацоўцы з'яўляюцца вершы з рускай народнай паэзіі — «Сёння дзень у нас светлы і радасны», з украінскай—«У каго ты, дзяўчынанька, тварам удалася», з іспанскай—«Яснавокая Аніга», з скандынаўскага — «Была Інгеборг, як сасонка, стройна», з персідскай—«Усё забыў на свеце і ведаю адно», з японскай—«Ах, як спявае сінявокая птушка» і інш.

М. Багдановіч перакладаў на беларускую мову класікаў сусветнай літаратуры: Пушкіна, Шэўчэнка, Некрасава, Гейне, Шыллера, Овідзія, Верхарна і інш., плённа выкарыстоўваў культурныя здабыткі сусветнай паэзіі і такім чынам узбагачаў беларускую літаратуру.



«Завод імя Варашылава ў Мінску» —эскіз карціны маст. Віера для выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Фота І. Капліскага.

У МАГАЗІНЕ

На працягу значнага часу мы некалькі разоў знаёміліся з мастацкай прадукцыяй магазіна Мінскага ізокамбіната. Здавалася-б, у гэтым магазіне мастацкай прадукцыі павінны былі быць прадстаўлены работы нашых лепшых беларускіх жывапісцаў і скульптараў, работы мастакоў братніх рэспублік. Гэтага, па сутнасці справы, няма. Беларускія мастакі тут прадстаўлены надзвычай слаба. Творчасць скульптара А. Грубэ прадстаўлена ў гэтым магазіне адной статуэткай, даўно зробленай ім і зусім не характэрнай для творчасці гэтага скульптара за апошнія годы. Здзіўляешся, што гэта далёка не мастацкая статуэтка яшчэ дагэтуль не знята з вытворчасці і прадаецца. Больш удачны па сваіх мастацкіх сродках бюст Сталіна, выкананы скульптарам С. Аншалевічам. Надзвычай нядбайна выканан і адфармаван скульптурны герб Беларускай ССР, выкананы А. Жоравым.

Не лепш і з жывапісам. Далёка не жывапісна выканан А. Забораўым партрэт Сталіна і Варашылава.

Шмат нядобраякаснай прадукцыі паступае ў магазіны Ізокамбіната з іншых гарадоў Саюза. Прыходзіцца толькі здзіўляцца, якім чынам магла трапіць у магазін ва ўсіх адносінах немастацкая копія карціны ленінградскага мастака І. Драздова «На Беламорканале». Усё тут расплыўчата, ні формы, ні колеру,— суцэльная мазня. А копія-ж гэта каштуе 1.400 рублёў!

Факты можна было-б памножыць. Нам думаецца, што як Ізокамбінату, так і Саюзу беларускіх мастакоў пара, нарэшце, навесці парадак у мастацкай вытворчасці і ў справах распаўсюджвання мастацкай прадукцыі. Ізокамбінату, з дапамогай Саюза мастакоў, неабходна старанна перагледзець выпускаемую на рынак прадукцыю і зняць з вытворчасці нягодныя працы, замяніўшы іх новымі, больш поўнацэннымі творамі мастацтваў, адпавядаючымі сучаснаму ўзроўню выяўленчага мастацтва Беларусі. Толькі зняважлівымі адносінамі да якасці і да мастацкіх запатрабаванняў працоўных можна растлумачыць той факт, што Ізокамбінат дагэтуль не здолеў спрацавацца з лепшымі мастакамі Беларусі, творы якіх павінны перш за ўсё заняць месца ў магазіне Ізокамбіната, знайсці дарогу праз гэты магазін да масавага спажыўца.

Нельга не сказаць і пра рэкламу памянёнага магазіна. Зараз магазін рэкламы не мае. Ды і нязручна рэкламіраваць магазін, калі якасць яго мастацкай прадукцыі нізкая. Лепшай рэкламай для магазіна Ізокамбіната павінна зрабіцца мастацкая поўнацэннасць жывапісных і скульптурных работ. Аб гэтым павінны паклапаціцца Ізокамбінат і самі беларускія мастакі.

А. ДАЛІН.

Эстрадная брыгада на ўборцы ўраджаю

8 жніўня з гастрольнай паездкі па раёнах Мінскай вобласці вярнулася эстрадная брыгада ў складзе 7-мі чалавек, арганізаваная аргкамітэтам Вярхоўнага Совета БССР па Мінскай вобласці, абласным аддзелам мастацтваў і Філармоніяй для абслугоўвання калгаснікаў у часе прапалачнай і ўборачнай кампаніі. Брыгада наведала Чэрвеньскі, Уздзенскі, Грэскі, Копыльскі, Чырвонаслабодскі і Старобінскі раёны, дала 47 канцэртаў, абслужыла 60 калгасаў і звыш 25.000 гледачоў.

Апрача канцэртаў, брыгада праводзіла палітмасавую работу, выпусціла вусную газету, прысвечаную Пасынцы Трэцяй Пяцігодкі (выпуск другога года).

Раённыя арганізацыі станоўча ацанілі канцэрты і ўсю работу брыгады па мабілізацыі калгасных мас на вырашэнне задач уборачнай кампаніі.

„БРАТ ГЕРОЯ“

Тэатр юнага гледача БССР рыхтуе п'есу пісьменніка-ордэнаносца Льва Кассіля «Брат героя». Спектакль ставіць малады ленінградскі рэжысёр З. М. Ерухімовіч. Музыку піша малады беларускі кампазітар А. Д. Лукас.

Спектакль будзе паказан у верасні бягучага года.

сінтэтычным позіркам зірнуць на літаратуры вялікарускую, украінскую і беларускую, як на адзіную вялікую літаратуру. Тады самастойнае развіццё кожнай з іх стане арганічнай часткай агульнарускага працэсу літаратурнага жыцця. Аналіз і дыферэнцыяцыю заўсёды добра ўвянчаць сінтэзам». (П. Н. Сакулін. «Синтетическое построение истории литературы». М. 1925, стар. 41—42).

Гэта думка П. Н. Сакуліна блізка падыходзіць да марксісцка-ленінскага разумення нацыянальнага пытання, бліскуча выражанага ў працах І. В. Сталіна.

***

Другім істотным пытаннем пры пабудове гісторыі беларускай літаратуры з'яўляецца праблема перыядызацыі. Наўрад ці трэба даказваць навуковую важнасць гэтай праблемы, гэта ясна без доказаў. З таго, што было сказана вышэй, выцякае, што перыядызацыя беларускай літаратуры павінна ў асноўных рысах супадаць з падзелам на перыяды літаратуры рускай і украінскай. Прымаючы-ж пад увагу перыядызацыю, прынятую і ў той і ў другой, атрымаем наступны падзел беларускай літаратуры:

І. Літаратура XI—XIII стагоддзяў. Літаратура Кіеўскай Русі, г. зн. таго перыяду, калі славянскія плямёны, не гледзячы на нязначныя адрозненні, прадстаўлялі адну магутную дзяржаву з Кіевам на чале. Культура і літаратура гэтага перыяду з'яўляецца асновай для далейшага развіцця літаратур рускай, украінскай і беларускай. Аб'ём помнікаў можа быць той-жа.

ІІ. Літаратура XIII — палловы XVI стагоддзя. Літаратура перыяду барацьбы Беларусі за сваю самастойнасць супроць улады літоўскіх і польскіх паноў. Гэта той перыяд, аб якім Ф. Энгельс у артыкуле «Знешняя палітыка рускага царызма» пісаў: «У той час, калі Вялікаросія трапіла пад мангольскае іга, Беларусь і Маларосія знайшлі сабе абарону ад азіяцкага нашэсця, далучыўшыся да так-званай Дзяржавы Літоўскай. Гэта дзяржава ў далейшым добраахвотна аб'ядналася з Польшчай». (К. Маркс і Ф. Энгельс. Зб. тв., т. XVI, ч. II, стар. 10).

Далучыўшыся да Літоўскай дзяржавы, Беларусь не страціла сваёй нацыянальнай культуры. Яна толькі жыла і развівалася ў іншых умовах, чым Русь паўночна-ўсходняя. Племянныя адрозненні, якія не адыгрывалі ніякай ролі ў кіеўскім перыядзе, атрымліваюць сваё развіццё і такім чынам складваецца беларуская мова і літаратура. Гэта настолькі магутныя культурныя фактары, што Літва трапляе ў культурную залежнасць ад Беларусі. Беларуская мова становіцца афіцыйнай дзяржаўнай мовай, але потым абставіны змяняюцца, з прычыны таго, што Літва добраахвотна далучылася да Польшчы.

Добраахвотнае аб'яднанне Літвы з Польшчай адбылося ў 1386 годзе, калі літоўскі князь Ягайла, ажаніўшыся на польскай каралеўне Ядвізе, аб'яднаў Літву і Польшчу ў адну дзяржаву. Абставіны, аб якіх гаворыць Ф. Энгельс, гэта значыць, што Беларусь знайшла сабе абарону ад азіяцкага нашэсця, ускладніліся новымі ўмовамі. Рускія землі цягнуліся цяпер к Маскве, што было прычынай войнаў паміж Масквой і Літвой пры Іване III. І, наадварот, Масква ўзмацнілася настолькі, што выказвала свае правы на аб'яднанне ўсіх рускіх земляў, гэта асабліва стала ясна, калі Масква склалася ў велізарную нацыянальную дзяржаву і пачала ператварацца ў дзяржаву шматнацыянальную. Гэта палова XVI стагоддзя. Тут мы і бярэм храналагічны падзел. З пункту погляду ўнутранай беларускай гісторыі гэта будзе 1569 год, г. зн. час Люблінскай уніі.

ІІІ. Літаратура XVI—XVIII стагоддзяў. Гэта літаратура перыяду сялянска-казацкіх войнаў супроць феадальнага і нацыянальнага прыгнёту, перыяду вызвалення Беларусі ад Польшчы і далучэння яе да Расіі.

Не гледзячы на страшэнны прыгнёт, які прымаў часам кашмарныя формы, беларускі народ захаваў сваю мову і сваю нацыянальнасць. Гэта патрабавала ад яго гераічнай барацьбы, прымаўшай часам жорсткія формы расправы з прыгнятальнікамі. Зразумела цягаценне Беларусі да Расіі, якое закончылася далучэннем яе ў XVIII стагоддзі пасля трох раздзелаў Польшчы пры Екацерыне II. Гістарычная тэндэнцыя адзінства зямлі рускай, ідэя аб'яднання народаў атрымала, нарэшце, сваё вырашэнне.

IV. Літаратура XIX стагоддзя. Гэта літаратура да Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Гэты перыяд можа быць разгледжан як адно цэлае. Тут беларуская літаратура, не гледзячы на русіфікатарскую палітыку царызма, прадаўжае жыць і развівацца. Яна атрымлівае сваё прызнанне і з боку рускага грамадства, што ярка выразілася ў звароце, надрукаваным у газеце Аксакава «День»: «Мы віноўныя перад вамі» (гл. Пыпін, «История русской этнографии», т. IV, стар. 89).

У XIX стагоддзі мацнеюць ніці, якія звязваюць беларускую літаратуру з літаратурай рускай, асабліва па рэволюцыйна-дэмакратычнай лініі.

V. Літаратура XX стагоддзя. Совецкая беларуская літаратура, літаратура пасля Кастрычніка 1917 года, нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу.

Мэтазгоднасць іменна такога падзялення літаратурнага матэрыялу абапіраецца на гістарычныя факты ў жыцці народа, выцякае з матэрыялістычнага разумення гісторыі. А яно прымушае нас шукаць у літаратурных творах і ідэях гістарычнае ядро.

***

Трэцім пытаннем павінна быць пастаўлена пытанне аб асаблівасцях вывучэння старой беларускай літаратуры. Яны такія-ж, як і ў літаратурах рускай і украінскай.

1. Перш за ўсё, у сваёй значнай частцы гэта **літаратура рукапісная**, што з'яўляецца нямалаважным фактам пры гісторыка-літаратурным аналізе. Нельга забываць на нязначную распаўсюджанасць такой літаратуры, бо для перапіскі патрабавалася шмат часу і працы. Слабая эвалюцыя літаратурных форм і прыёмаў выклікалася ўказанымі вышэй абставінамі. Многія помнікі страчаны, бо пры невялікай колькасці наяўных экземпляраў яны лёгка губляліся, калі непасрэдная цікавасць да адлюстраваных у ёй падзей страчвалася. У сувязі з пытаннем аб рукапісным характары старой літаратуры трэба ўпамянуць аб рэдакцыі помніка. Рэдакцыяй трэба назваць літаратурную перапрацоўку помніка з пэўнай мэтай, якая выклікалася тымі ці іншымі прычынамі. Тут-жа ўпамянем і аб «ізводах». Пад «ізводам» помніка трэба разумець тую рэдакцыю беларускага рукапісу, які быў пісан з замежнага арыгінала.

2. Датыраванне твораў. Вызначэнне даты, храналагічнае прыўрочванне помніка — справа досыць складаная ў старой літаратуры. Гісторыкі літаратуры выпрацавалі для гэтай мэты многа прыёмаў:

а) матэрыял, на якім напісан твор, можа даць штуршок да ўстанаўлення часу напісання;

б) шрыфт: статут (XI—XIV стагоддзі), поўстатут (XIV—XV стагоддзі), скорапіс (XV—XVI стагоддзі);

в) вадзяныя знакі ўказваюць на час вырабу паперы;

г) наяўнасць і характар мініятур, заставак, загалоўных літараў (у XI—XII стагоддзях геаметрычны арнамент, у XIII—XIV — тэраталагічны, у XV — зноў геаметрычны, але іншага тыпу, у XVI—XVII — кветкавы ці траўны;

д) запісы ў канцы рукапісу;

е) аналіз зместу і ўстанаўленне таго, што ў ім адлюстравана.

3. Пытанне аб аўтару. У большасці сваіх помнікаў старая літаратура ананімная. Вызначэнне аўтара справа вельмі цяжкая. Тут мы ідзём па лініі вызначэння не асобы, а соцыяльнай пазіцыі аўтара, якая заўсёды можа быць раскрыта пры аналізе тэксту, ідэйнай сутнасці і эстэтычных асаблівасцей помніка.

4. Прынцып адбору матэрыялу. Прынцып адбору матэрыялу ці вызначэнне аб'екта вывучэння — справа вельмі складаная. Умовімся прыцягваць тыя творы, якія маюць мастацкае значэнне, прымаючы пад увагу, што сама мастацкасць павінна быць зразумета гістарычна. Трэба імкнуцца да размежавання помнікаў літаратурных ад помнікаў пісьменнасці наогул, ад помнікаў культуры.

5. Уплывы, перайманні, пераробка і перапрацоўка літаратурных помнікаў. Ва ўмовах развіцця старой беларускай літаратуры гэта вельмі складанае і важнае пытанне. Гаворачы аб перайманнях, уплывах, пераробках і перапрацоўках помнікаў, узятых з розных бакоў, мы не павінны забываць аб народзе, аб тым, што калі што бралася і перараблялася, дык выходзячы з якіхсьці патрэб. У аснове ляжыць развіццё народа, яго самастойнае жыццё, а ўжо яго патрэбамі тлумачыцца пераймане, пераробка помніка і яго прыстасаванне да сваіх умоў.

6. Ступень захавання і наяўны фонд старой беларускай літаратуры. Да нас дайшло шмат помнікаў беларускай літаратуры, але яны вельмі раскіданы і нават невядома, дзе знаходзяцца. Імперыялістычная вайна 1914—18 г.г. развеяла шмат якія культурныя каштоўнасці Беларусі. Многае, мусіць, з таго, што было вядома такім даследчыкам, як Карскі, згублена ці недасягальна ў даны момант нашаму даследванню. Гэтым вызначаецца цяжкасць адказу на пастаўленае пытанне. Найбольш поўнае ўяўленне аб наяўным фондзе беларускай літаратуры і яго месцазнаходжанні дае Е. Ф. Карскі ў сваёй працы «Белоруссы» (уступ да вывучэння мовы і народнай славеснасці), а таксама ў III томе, які складаецца з трох выпускаў: І. Народная паэзія. М. 1916 г., II. Старая заходнеруская пісьменнасць. П. 1921 г., III. Мастацкая літаратура на роднай мове. П. 1922 г.

***

У сувязі з пытаннем аб наяўным фондзе і ступені захавання стаіць пытанне аб **гісторыяграфіі беларускай літаратуры.** Звесткі аб асобных творах беларускай літаратуры і ў асаблівасці беларускай мовы сустракаюцца досыць рана і ў рускай і ў украінскай літаратуры. Гісторыка-літаратурных прац на беларускай мове няма ці амаль няма, калі не лічыць невялікіх артыкулаў, якія маюць хутчэй інфармацыйны, чым даследчы характар. З прац старых даследчыкаў адзначым працы А. Н. Пыпіна: «Очерк литературной истории старинных повестей и сказок русских», дзе ўпамінаюцца асобныя беларускія творы; «История русской этнографии», т. IV, якая складаецца з наступных раздзелаў: І. Гістарычныя заўвагі; II. Беларусь у эпоху далучэння. Працы польскіх вучоных; III. Песенныя зборнікі Чачота, Зенкевіча; кніга гр. Еўстафія Тышкевіча — Спробы беларускай літаратуры; IV. Рускія працы па беларускай этнаграфіі; V. У шасцідзесятых годах; VI. Новыя этнаграфічныя даследванні; VII. Навейшы час.

Праз 12 год пасля выхаду работы акадэміка П. Пыпіна выйшла работа праф. Карскага «Белоруссы», т. І, якая заключае ў сабе наступныя раздзелы: І. Тэрыторыя, занятая беларускім племенем. Граніцы і агульны характар краіны; II. Старажытныя жыхары беларускай тэрыторыі ў дагістарычны час і пры пачатку Рускай дзяржавы; III. Мова рускіх плямён, якія насялялі беларускую тэрыторыю ў старажытны час. Зараджэнне беларускіх асаблівасцей. Старэйшыя слоўныя перайманні — у фінаў і іранцаў; IV. Аб'яднанне ўсіх беларускіх плямён пад уладай Літвы і канчатковая выпрацоўка «беларускай народнасці» і «беларускай мовы». Перайманні з літоўскай і латышскай моў; V. Беларусы разам з літоўцамі пад уладай Польшчы. Наплыў розных замежных слоў у беларускі говар; VI. Злучэнне Беларусі з агульнарускім жыццём. Колькасць беларусаў у сучасны момант і іх народныя говары; VII. Нарыс вывучэння жывой беларускай мовы і народнай паэзіі; VIII. Нарыс паступовага азнаямлення вучоных з помнікамі старой заходнерускай мовы. Вывучэнне самой мовы; IX. Не народныя творы на сучаснай беларускай мове.

(Прадаўжэнне на 4 стар.).

„Дняпро выходзіць з берагоў“

Зборнік вершаў Алеся Жаўрука выйшаў яшчэ ў мінулым годзе. Да гэтага часу пра яго ў друку не было ні слова. Гэта— незаслужанае замоўчванне маладога аўтара, у вершах якога ёсць і пачуццё, і шчырасць, і нават паэтычны пафас.

У зборніку «Дняпро выходзіць з берагоў» змешчаны вершы за 1936—1938 годы, лірычны цыкл «Рагачоўскі сшытак» і паэма «Крывёю сэрца». Зборнік станоўча рэкамендуе маладога аўтара і пакідае ў чытача добрае ўражанне. Што да тэматыкі, то яна вызначаецца, як кажуць, актуальнасцю. Але гэтае слова яшчэ, бадай, нічога не гаворыць пра мастацкі профіль, бо яно занадта агульнае.

У сваіх вершах паэт гаворыць пра «сіняе неба радзімы і палёў неабсяжны прастор», пра далі, залацейшыя за сонца, пра звонкі і малады дзень, што ўстаў над зямлёю ў песнях і гаспадарскай рупнасці; гаворыць пра маладосць сваю «без прыгод, вычытаных з кніжок», пра сваё каханне і тугу, пра шчаслівы смех дзяцей, пра дружбу, якая натхняе людзей да творчай дзейнасці, пра пачуцці савецкіх людзей, пра чалавечую шчырасць і цеплыню, пра самую высокую любоў — любоў да радзімы і вялікага Сталіна.

Найчасцей паэт гаворыць простым, шчырым голасам, гэта значыць, што вершаваны спосаб перадачы ўсяго бачанага і перажытага з'яўляецца для яго найбольш натуральным. Невыпадкова да слова «песня» паэт ставіць эпітэты «простая» і «шчырая». Прыемна адзначыць, што паэтычны голас яго з часам усё больш сталее, што паэт усё больш ясна адчувае мастацкую спецыфіку слова, што ён унікае лёгкай рытарычнасці. Сказанае азначае пакуль-што толькі рысу, якая яшчэ не стала агульным творчым планам паэта. Таму вершы, змешчаныя ў зборніку, не аднолькавыя па сваёй мастацкай вартасці. Тут ёсць такія вершы, як «Песня пра дукорскіх партызан», «Слова выбаршчыка Прова Ягоравіча Багачова» і часткова іншыя, тэмы якіх не прачуты, паэтычна не асэнсаваны, а толькі названы. Гэтыя вершы паўтараюць ужо вядомае, прывычнае і па падыходу да тэмы і па яе вырашэнню. У іх няма яркага і новага паэтычнага слова, таго, што называецца паэтызацыяй з'явы.

Характэрнымі для Жаўрука па лірычнасці вырашэння тэмы з'яўляюцца такія вершы, як «Дняпро выходзіць з берагоў», «Ліст на заставу», «Лівень», «Рагачоўскі сшытак», «Верасень тонкі», «Зноў за акном бліскавіцы мільгаюць», «Сэрца маёй зямлі», «Насустрач дню» і інш. Названыя вершы рэкамендуюць Жаўрука як лірычнага паэта перш за ўсё. Паэтычны рысунак даецца найчасцей у мяккім лірычным тоне. Зарысоўкі прыроды служаць агульнаму заданню, дапамагаюць узвышэнню эмацыянальнага тону, арганічна ўплятаючыся ў агульны малюнак, акцэнтуючы, адцяняючы патрэбнае з пункту гледжання аўтара, альбо з'яўляюцца фонам, паэтычнай рамкай пачуцця лірычнага «я». Лірычнае «я» ўстае перад чытачом у вобразе чалавека, закаханага ў жыццё, у яго найбольш яркія праявы. Паэт лічыць за лепшае ісці праз жыццё з песняй дружбы, якая ўслаўляла-б «шчасце радзімы» і заклікала-б на змаганне з рознымі нягодамі. Мы тут падыходзім да ўлюбёнай тэмы Жаўрука.

Улюбёнай тэмай Жаўрука з'яўляецца тэма чалавечай дружбы, дружбы савецкіх людзей. Гэта найбольш інтымная тэма паэта, асабістая і разам з тым зніттаваная з грамадска-значымымі матывамі. Тэма дружбы ляжыць у аснове раду лірычных вершаў, яна пераплятаецца з іншымі тэмамі, гучыць, бадай, заўсёды эмацыянальным акордам, надаючы вершу лірычнасць і непасрэднасць. Гэта тэма ўжо намячалася ў зборніку «Ручаіны». У новым зборніку яна набыла больш шырокі сэнс і абагульняючы характар, з'яўляючыся выражэннем агульнага росту паэта.

У вершы «Дняпро выходзіць з берагоў» паэт гаворыць: «І песняй простаю і шчырай уславім дружбы светлы шлях...» Паказваючы чалавечыя дачыненні, пачуцці, паэт перш за ўсё шукае самае істотнае, з яго пункту гледжання, — дружбу, бачачы ў ёй праяўленне вышэйшай чалавечнасці. Паэт думае «пра цёплую дружбу, што з'еднала народы навек» у вершы пра Сталіна — «Сэрца маёй зямлі»; гаворыць пра дружбу ў пісьме на пагранічную заставу, у вершы пра архітэктара, у паэме «Крывёю сэрца», у вершах, прысвечаных асабістым перажыванням.

Сіла дружбы правяраецца ў барацьбе за радзіму, за агульную справу, яна становіцца яшчэ мацнейшай, прайшоўшы выпрабаванні.

Паэма «Крывёю сэрца» прысвечана паказу барацьбы іспанскага народа з фашысцкай інтэрвенцыяй. Аўтар паэмы перадаў нам «аповесць сумную» пра жыццё, самаахвярнае змаганне з інтэрвентамі і герaічную смерць дачкі шахцёра з-пад Овіедо Франсіскі Н'ето, біяграфія якой — гэта жыццё тысяч дачок іспанскага народа. «Маленькая мадыстка з зіцячым сумам у вачах», раней нікому невядомая, становіцца народнай гераіняй, пра якую спяваюць песні таварышы, ідучы ў бой. Перад смерцю закатаваная Франсіска, трацячы прытомнасць, у апошні раз прыгадвае свой кулямёт, спеў таварышоў, зямлю абноўленай савецкай краіны. Апавяданне скончана. У заключэнне паэт малюе раніцу на нашым узмор'і, дзе каталонец Барталамео Гільярдо ўсхвалявана апавядае пра Франсіску, яе жыццё і смерць. Заканчваецца паэма такімі словамі:

Ужо днела...
Дзень вялікі, новы —
Я знаў — чаканаю вясной
Устане з кіпені барвовай
Над залатой яго Кардовай,
Як ўстаў над Прэсняю маёй!


У паэме «Крывёю сэрца» бадай няма мастацкага вымыслу, але ад гэтага яе мастацкая вартасць не зніжаецца. Лепшае ў гэтай паэме — яе лірычны тон, цеплыня, якой сагрэт вобраз іспанскай дзяўчыны. Хай сабе і ў скупых рысах, але перад намі ўстае вобраз чалавека, якому хочацца следаваць і які дораг паэту. Паэт прачуў тэму і таму ўся рэч прасякнута цеплынёй, якая надае абаяльнасць твору. Важна, што ў паэме няма шматслоўя, надуманасці, што ў аснове яе ляжыць натуральнасць. Адступленні не выходзяць з агульнага плана, таму малюнак не разрываецца на часткі. І галоўнае — аўтар расказвае ўзятую гісторыю, як гісторыю блізкіх і дарагіх яму людзей.

Лепшыя вершы Жаўрука дадатна вылучаюцца сярод вершаў раду іншых маладых аўтараў не толькі сваёй прастатой, непасрэднасцю пачуцця, але і больш дбайнай апрацоўкай, так сказаць, паэтычным тактам. Шкада толькі, што Жаўрук не заўсёды аднолькава патрабавальны да сябе і часам падмяняе новае лірычнае асэнсаванне тэмы ўжо настолькі прывычным падыходам да яе, вырашэннем яе ў такім занадта агульным плане, без мастацкіх дэталей, што верш нічога новага чытачу не гаворыць (вершы «Песня пра дукорскіх партызан», пра выбаршчыка Багачова, «Гаспадары»); часам падмяняе пошукі свежага, арыгінальнага слова ўжываннем прывычных, трафарэтных словазлучэнняў, сцёртых фраз, якія не нясуць ні страсці, ні пачуцця. Асабліва прыкра, калі такія прывычныя, сцёртыя словазлучэнні ўрываюцца ў паэтычную тканіну і сваёй празаічнасцю зніжаюць агульны эмацыянальны тон. Вось некаторыя прыклады такіх прывычных фраз: «узнялі **гнеўныя** штыхі», «пабудую санаторый... **горды,** як палац», «нашы **мужныя** кагорты», «чэлюскінцаў **мужных», «рашучы** крок», **«светлай** долі», **«жывымі** справамі», **«гераічны** выходзіць шлях», «снягі, **як дываны»** і інш. Гутарка ідзе пра шаблон. Паэт павінен быць смелым наватарам у мове, гаварыць сваім голасам, адштурхоўвацца ад прывычнага, ужо вядомага.

Бывае, што Жаўрук ужывае словы неадпаведна іх зместу. Стары калгаснік на выбарчым сходзе расказвае пра сваё пакутнае жыццё ў мінулым і шчаслівае сёння. У Жаўрука ён гаворыць: «Ды цяпер больш, браты, **не маюся»,** г. зн. — не пакутую, хацеў сказаць Жаўрук. «Не маюся» ў такім сэнсе па-беларуску сказаць нельга. Нельга-ж апраўдваць такое ўжыванне слова толькі патрэбай даць рыфму да слова «пытаюся». Вось яшчэ прыклад: «блізасць сярдзец». Слова «сярдзец» (замест «сэрцаў») ужыта таксама для рыфмы са словам «йдзе», праўда, не зусім удалай. «Заўтра прыйдуць нашы — **ўлада працы»,** — так гаворыць у Жаўрука невялікі хлопчык у годы грамадзянскай вайны. Фраза не на месцы і гучыць штучна. І тут «ўлада працы» ўжыта толькі для рыфмы са словам «паны». Усе прыведзеныя прыклады сцвярджаюць неабходнасць для Жаўрука больш рупна працаваць над узбагачэннем сваёй паэтычнай лексікі, над павышэннем сваёй эстэтычнай культуры і густу наогул.

Апошні зборнік Жаўрука значна адрозніваецца ад зборніка «Ручаіны», які выйшаў у 1936 годзе. Многія вершы зборніка «Ручаіны» можна назваць вершамі даволі ўмоўна, вершамі першай паэтычнай спробы. Там паэт яшчэ не мог валодаць істотна неабходным для сапраўднай творчасці; тэма не знаходзіла ясна акрэсленага выражэння ў вершы. Паэт, не маючы належнага вопыту, навыку ў майстэрстве, у адным вершы, бывала, хацеў сказаць аб усім, а гэта запямняла, не выпуклявала асноўнага. Рыфма насіла часам вельмі ўмоўны характар, а ў лексіцы рэдка траплялiся яркія словы-вобразы, якія затрымлівалі-б увагу чытача. Ад гэтага ў новым зборніку паэт у значнай ступені вызваліўся, што дае падставы гаварыць аб фарміраванні і росце сапраўднай творчасці.

І. ПЛАШЧЫНСКІ.



7 жніўня мінула 225 год з дня бліскучай перамогі рускага флота над шведамі пры Гангуце. На здымку: «Гангупкае сражэнне» — карціна маст. Багалюбава (цэнтральны Ваенна-марскі музей у Ленінградзе).

Рэпрадукцыя фотахронікі ТАСС.

ДА ПЫТАННЯ АБ СТВАРЭННІ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(Канец).

Яшчэ праз семнаццаць год выйшаў III том працы Карскага, выпуск 2. «Старая заходнерусская письменность.» Яна прадстаўляе агляд перакладной літаратуры (кнігі св. пісання, зборнікі павучанняў, жыцій, апокрыфаў, забабонных і гадальных кніг, духоўных і свецкіх аповесцей, кніг гістарычнага зместу) і самастойных твораў (летапісаў, гістарычных твораў, помнікаў юрыдычнага характару, твораў рэлігійна-багаслоўнага характару, палемічнай рэлігійнай літаратуры і т. д.) на беларускай мове.

Працы Карскага, не гледзячы на некаторыя недахопы, да гэтага часу застаюцца асноўнымі працамі па гісторыі беларускай літаратуры і фальклору. Акрамя іх, з старых прац назавём працу А. Н. Весялоўскага «Из истории романа и повести» (вып. II, СПБ, 1888), дзе дадзен разгляд беларускіх аповесцей аб Трыстане, Бове, Аціле з Пазнанскага зборніка XVI стагоддзя; працы П. В. Уладзімірава «Обзор южно-русских и западно-русских памятников письменности от XI до XIII ст.» і «Доктор Франциск Скорина, его переводы, печатные издания и язык» (СПБ, 1888); працу А. С. Архангельскага «Очерки из истории западно-русской литературы XVI—XVII вв.» (в «Чтениях» Моск. Общ. истории и древности, 1888).

Мы маглі-б назваць шматлікія выданні на беларускай, рускай і украінскай мовах помнікаў беларускай славеснасці і асобныя працы і артыкулы, прысвечаныя ім, але мы яшчэ не маем работ па гісторыі беларускай літаратуры, колькі-небудзь здавальняюча асвятляючых яе з марксісцка-ленінскага пункту погляду. Стварэнне такой гісторыі літаратуры—наша чарговая задача.

***

Асобнае месца павінна займаць пытанне аб узаемаадносінах фальклору і старой беларускай літаратуры. Мы не маем магчымасці асвятляць гэта пытанне цяпер. Падкрэслім толькі наш погляд на гэты прадмет. На нашу думку, гісторыка-літаратурны працэс адзіны, але ідзе двума напрамкамі: вуснай і пісьмовай творчасці. Не трэба сумнявацца ў тым, што ад старажытнейшых часоў аж да нашых дзён фальклор спадарожнічае гісторыі народа і гісторыі літаратуры.

На гэта вельмі добра ўказаў А. М. Горкі: «Сапраўдную гісторыю працоўнага народа нельга ведаць, не ведаючы вуснай народнай творчасці, якая бесперапынна і выразна мела ўплыў на стварэнне такіх буйнейшых твораў кніжнай літаратуры, як, напрыклад, «Фауст», «Прыгоды барона Мюнхгаўзена», «Гарганцюа і Пантагруэль», «Ціль Уленшпігель» дэ Костэра, «Вызвалены Праметэй» Шэлі і шмат іншых. Ад глыбокай старажытнасці фальклор неадступна і своеасабліва спадарожнічае гісторыі. У яго свая думка аб дзейнасці Людовіка XI, Івана Грознага, і гэта думка рэзка разыходзіцца з ацэнкай гісторыі, напісанай спецыялістамі, якія не вельмі цікавіліся пытаннем аб тым, што іменна ўнесла ў жыццё працоўнага народа барацьба манархаў з феадаламі» (А. М. Горкі. «О литературе», М. 1934).

Калі гэта правільна, а гэта, бяспрэчна, правільна, дык перад намі задача: даць гісторыю фальклору, паралельную гісторыі пісьменнай літаратуры. Гэта — цяжка, а некаторыя спецыялісты па фальклору сцвярджаюць, што ў дадзены час і наогул немагчыма (гл. работу праф. Ю. М. Сакалова «Русский фольклор», М. 1938, стар. 17 і далей). Затое праблема сувязі і ўзаемнага ўплыву вуснай паэзіі на літаратуру і мастацкай літаратуры на вусную паэзію не выклікае ніякіх сумненняў і прызнаецца ўсімі безумоўна. Гэтым вызначаецца і месца фалькларыстыкі ў гісторыі літаратуры. Першая — неад'емная частка другой.

Стварыць поўную гісторыю беларускай літаратуры, значыць стварыць яе як гісторыю пісьменнай і вуснай творчасці ў іх непарыўнай сувязі і бесперапынным узаемадзеянні, гэта значыць раскрыць, як у мастацкіх вобразах адлюстравалася жыццё ўсяго народа, а не толькі нязначных колаў грамадства. Зрабіць гэта без фальклору нельга, бо «найбольш глыбокія і яркія, мастацка дасканалыя тыпы герояў створаны фальклорам, вуснай творчасцю працоўнага народа» (М. Горкі). Іменна ў фальклоры найбольш ярка праяўляюцца нацыянальныя народныя асновы літаратуры, раскрываецца багатая народная беларуская мова.

***

У заключэнні мы закранаем пытанне **канструктыўнае, пытанне кампазіцыі ці архітэктонікі.** Справа ў тым, што не ўсе перыяды старажытнай беларускай літаратуры могуць быць асветлены і выкладзены з дастатковай паўнатой і паслядоўнасцю. Нават больш, скажам прама, што некаторыя важныя эпохі вызначаны толькі пункцірам, ды і то не зусім ясным. Напрыклад, усе даныя гавораць аб тым, што ў XIII стагоддзі Беларусь мела багатую літаратуру і што гэта літаратура развівалася па тых-жа літаратурных напрамках, як і родныя літаратуры руская і украінская. Не будзе перавелічэннем гаварыць аб класіцызме, сантыменталізме, рэалізме ў беларускай літаратуры XVIII стагоддзя. Аднак, усё гэта ад нас захавана, покуль не распрацаваны архіўныя матэрыялы. Нельга думаць, што Беларусь, якая іграла вялікую ролю ў культурных зносінах Масквы і Захаду, сама не мела-б сваёй літаратуры. Яшчэ А. Н. Пыпін указваў на велізарнае значэнне, якое мелі паўднёвыя і заходнія школы і літаратуры для далучэння рускага народа да сусветнай культуры.

Усё гэта ўказвае на значны культурны ўзровень Беларусі, на ўзровень, які не мог знікнуць адразу і без следу. Праўда, асаблівасці палітычнага становішча Беларусі, прыгнёт і праследванні з боку Польшчы, апалячванне і акаталічванне беларускай інтэлігенцыі і адыход часткі яе ў стан ворагаў народа нанеслі непапраўную шкоду справе народнай культуры і народнай літаратуры. Затое сапраўдны носьбіт і тварэц культуры—беларускі народ выратаваў сваю мову, свае сілы, сваю літаратуру для далейшага развіцця.

Ад рэдакцыі: Артыкул праф. М. Дабрыніна друкуецца ў парадку абмеркавання.

НОВЫЯ ТВОРЫ ЛЕНІНГРАДСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

1. ОПЕРА «ІУДЗЕЙСКАЯ ВАЙНА».

Кампазітар М. Мільнер працуе над народна-гераічнай операй па раману Л. Фейхтвангера «Іудзейская вайна» (аўтар лібрэта В. Вальдман). У гутарцы з нашым карэспандэнтам кампазітар паведаміў:

— У гэтай оперы я хачу перадаць атмасферу народна-рэвалюцыйнай вайны Іудэі з Рымам, барацьбу за нацыянальную незалежнасць і свабоду прыгнечанага народа супраць іншаземнага ўладарніцтва. Асноўная фабульная лінія рамана Фейхтвангера захавана і ў лібрэта, але галоўным героем оперы будзе не Іосіф Флавій, а правадыры народных мас—сялян і рамеснікаў—Сімон бар Гіора, Іоанн з Гіпалы, Сапіга з Трыверыяды. Значнае месца аддаецца ў оперы артысту Лібану—фігуры надзвычай каларытнай і своеасаблівай.

Гісторыя не захавала нам сапраўдных напеваў сівой старажытнасці, аб якой расказвае раман і якая складае змест спекталя. Аднак, вядомы так званыя тропальныя напевы (тропы—асобныя знакі, кожны з якіх выражае кароткую музычную фразу). Яны будуць шырока выкарыстаны ў оперы, таксама, як і старажытная пяціступенная гама. Для музычнай характарыстыкі рымлян я выкарыстаю некаторыя старагрэчаскія лады—галоўным чынам дарыйскі і эолійскі.

Зараз працую над другім актам оперы. Увесь твор будзе, відавочна, закончан к канцу гэтага года.

2. АПЕРЭТА «САПРАЎДНЫ ЖАНІХ»

Так называецца новая аперэта, якую піша для тэатра Музкамедыі кампазітар Р. Свірыдаў па лібрэта М. Левіціна (тэкст песень В. Уладзімірава). У гутарцы з нашым карэспандэнтам тав. Свірыдаў паведаміў:

—Кампазітар і драматург маюць на мэце напісаць чыста жартоўную, вясёлую аперэту, пазбаўленую назойлівай «маралі».

Дзеючыя асобы аперэты — актрыса Лена Сухарэўская, яе бацькі, браты-блізнюкі Пётр і Васіль Багданавы (ролю іх выконвае адзін актор), домработніца, якая стала спявачкай, рэжысёр і артысты плывучага тэатра «Шчаслівы пуць» і г. д. Братоў-блізнюкоў увесь час блытаюць і з прычыны гэтага на сцэне ўвесь час адбываецца шмат вясёлых непаразуменняў. Усе персанажы аперэты — «станоўчыя» героі, за выключэннем Самсона Пулькіна, аліментшчыка і падлюгі, які хаваецца ад сваёй жонкі і па чарзе прызнаецца ў каханні ўсім знаёмым дзяўчатам.

Цяжка пераказаць сюжэт аперэты, бо ён складаецца з раду змыкаючыхся і пераплятаючыхся адна з другой сюжэтных ліній. У аснову яго ўзяты адносіны артысткі Лены Сухарэўскай і студэнта, пачынаючага драматурга Пятра Багданава. Лена, ратуючыся ад назойлівых «узлыхацеляў», рашае ўзяць сабе «падстаўнога» жаніха — Пятра Багданава. Яна ўпэўнена, што Пётр зусім абыякава адносіцца да яе, а на самой справе Багданаў закаханы ў Лену. У канцы канцоў і Лена закахалася ў свайго падстаўнога жаніха, але інтрыган Пулькін пераменшвае ўсе карты і аддаляе к канцу 3-га, апошняга, акта шчаслівую развязку.

У музыцы я імкнуся усяляк падкрэсліць элементы буфанады, якія знаходзяцца ў лібрэта. Зараз заканчваю першы акт. У верасні — кастрычніку разлічваю закончыць усю аперэту. Прэм'ера павінна адбыцца ў канцы 1939 ці ў пачатку 1940 года.

Ленінград **(наш. кар.)**

У ЛЕНІНГРАДСКІМ САЮЗЕ САВЕЦКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

⊙ Дзмітрый Шастаковіч нядаўна прыступіў да працы над аперэтай «12 крэслаў» (паводле вядомага аднайменнага рамана І. Ільфа і Е. Пятрова). Лібрэта для аперэты пішуць Еўгеній Пятроў і ленінградскі паэт Влад. Уладзіміраў.

⊙ Кампазітар Багданаў-Беразоўскі піша оперу «Лётчыкі» па ўласнаму лібрэта.

⊙ Кампазітар Дзяшоваў працуе над балетам «Залатая рыбка».

⊙ Ходжа—Эйнатаў закончыў оперу «Сям'я» па лібрэта І. Зельцэра на тэму аб яўрэях у Біраблджане. Опера прынята к пастаноўцы Ленінградскім ордэна Леніна Малым оперным тэатрам.

⊙ Оперу «Слава» па лібрэта В. Гусева напісаў кампазітар Валошынаў. Опера прынята к пастаноўцы Ленінградскім ордэна Леніна тэатрам оперы і балета імя С. М. Кірава. Там-жа прынята к пастаноўцы опера Левіціна «Монна-Марыянна» (лібрэта Каплана).

У Дзяржвыдавецтве БССР

ЗБОРНІК АПАВЯДАННЯЎ АБ ЛЕНІНЕ

Здадзен у друк зборнік апавяданняў аб Леніне. У зборнік увайшлі апавяданні савецкіх пісьменнікаў, а таксама ўрыўкі з твораў рэвалюцыйных пісьменнікаў Захаду.

Размер зборніка 15 друкаваных аркушаў.

ПЕСНІ І ВЕРШЫ АБ СТАЛІНЕ

Падрыхтаван да друку зборнік песень і вершаў аб Сталіне. У зборнік увайшлі творы паэтаў-ордэнаносцаў Стальскага, Джамбула, Купалы, Коласа, Бажана, Жарава, Броўкі, Глебкі, Суркова, Квітко, Перэца Маркіша, Лебедзева-Кумача і інш., а таксама фальклорныя песні аб Сталіне.

Такі зборнік выдаецца ў СССР упершыню. Размер зборніка 13—14 друкаваных аркушаў.

НОВЫЯ ВЫДАННІ

★ Выйшла з друку «Казка аб мёртвай царэўне і аб сямі асілках» А. С. Пушкіна ў перакладзе А. Якімовіча.

★ На рускай мове выйшла з друку аповесць «Сляпы музыкант» В. Г. Караленка.



Новы 24-кватэрны дом па Доўгабродскай вуліцы для пераехаўшых з Ленінграда ў Мінск рабочых і служачых кінастудыі «Совецкая Беларусь».

Фотахроніка БЕЛТА.

„ПАГІБЕЛЬ ВОЎКА“

У РАГАЧОЎСКІМ КАЛГАСНА-САЎГАСНЫМ ТЭАТРЫ

П'еса «Пагібель воўка» пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка з'яўляецца каштоўным укладам у беларускую драматургію. Як-жа справіўся калектыў Рагачоўскага калгасна-саўгаснага тэатра з яе пастаноўкай?

Трэба адзначыць, што п'еса была часткова перароблена пастаноўшчыкам Ю. Н. Рэшымавым і ў некаторых месцах значна адрозніваецца ад літаратурнага варыянта. Так, у першым акце апушчана другая карціна, у трэцім акце не паказана сцэна з пабудовай брамы. Не ўключаны ў пастаноўку дзед Анісім, Шышка і Шабінскі.

Нельга сказаць, каб гэта скарачэнне не адбілася адмоўна на пастаноўцы. Хаця ў цэлым ідэя п'есы захавана, аднак рад вобразаў аказаўся пазбаўленым усёй паўнаты характарыстыкі, так старанна выпісанай аўтарам. Асабліва гэта адчуваецца на ролях калгасніка Язэпа, Насці, Ліды, і без таго скупога на словы Мірона Бокуця, і часткова Харкевіча.



Мірон Бокуць—арт. Г. Свірчэўскі.
Мал. Е. Гаробчанка.

Уся складаная сетка драматургічнай пабудовы п'есы, дзе кожнае слова, кожная дэталь мае сваю поўную задачу і дапамагае раскрываць вобразы, таксама аказалася некалькі парушанай. Але, як мы вышэй адзначалі, у цэлым ідэя п'есы засталася непарушанай. Асноўная ідэя п'есы—не пагібель панскага прыслужніка, халуя Харкевіча, хоць на яго подлай дзейнасці ў асноўным пабудавана фабула п'есы, а пагібель шпіёна—дыверсанта Харкевіча. Аўтар п'есы гэтым сцвярджае, што кожны вораг, як-бы хітра ён ні маскіраваўся, рана ці позна будзе выкрыт і знішчан. Вось як аб гэтым гаворыць Язэп:

... «Няўжо гэта яны сілы нашай не разумеюць? Ім таварыш Сталін сказаў: вашай зямлі не хочам, сваёй вяршка не аддамо: і не лезьце лепей з лычом свінячым у наш савецкі агарод! Сказана гэта ім было? Сказана!.. Усёроўна паўзуць на жыватах. Ну, куды-ж ты проці ўсёй народнай сілы прэш, морда ты аблезлая. Перапаўзе, бадзяецца па лесе, пагранічнікам клопат, нам неспакой... Усёроўна-ж, цябе праклятага, зловяць! Ну, куды-ж ты падзенешся?».

Эдуард Самуйлёнак у сваёй п'есе паказаў таксама пагібель воўка ў свядомасці чалавека. Аб гэтым так гаворыць калгаснік Мірон Бокуць: «Дык вось як мінулае мне ўспамінаецца... Кожны ў душы ваўка насіў, кожнаму смага нажывы сэрца смактала, бо не нажыцца—значыла загінуць.

... Многа ад тэй пары мінула год. І прышла-ж пагібель воўка! Вось мы тут дружнай сям'ёй... Нам няма з-за чаго сварыцца, нам няма з-за чаго аднаму на другога нападаць, мы вольныя савецкія земляробы, багатыя ад працы сваёй!»

Трэба адзначыць, што ў пастаноўцы звернута больш увагі на пагібель воўка—Харкевіча, чым на воўка ў душы чалавека.

Вобраз Харкевіча, створаны артыстам Б. Савічам, трэба прызнаць даволі ўдалым. Перад намі ўстае мацёры воўк, хітры, бязлітасны, які ўмомант змяняе аблічча ў залежнасці ад абставін.

Б. Савіч знайшоў рад добрых дэталей, якія дапамагаюць яму ў раскрыцці гэтага складанага вобраза. Але нам здаецца, што ў другім акце, пры сустрэчы з начальнікам пагранзаставы Усенка і настаўніцай Лідай, актор перaігрывае, занадта мітусіцца, стараючыся дагадзіць Усенку. Ён павінен быў не так заісківаць перад гасцямі, бо гэта магло выклікаць у іх здзіўленне, а потым і падазрэнне. Наогул-жа роля Харкевіча вядзецца добра і безумоўна з'яўляецца значным дасягненнем актора.

Ролю Мірона Бокуця—старэйшага, ўсімі паважанага калгасніка, які вынес на сваіх плячах дванаццаць год катаргі, выконвае арт. Г. А. Свірчэўскі. У асноўным ён добра і пераканаўча вядзе ролю, але ў першым акце, у сутычцы з Вырвічам, занадта хвалюецца і крычыць. Гэту сцэну, на наш погляд, трэба іграць больш глыбока, каб адчувалася ўнутраная сіла Мірона, каб словы сказаныя аб ім Вырвічам: ... «Ну-ж, чалавечак! Што гэта за цаца была змоладу?»—апраўдваліся не вонкавай, а ўнутранай ігрой.

Шчыры і хвалюючы маналог Мірона—Свірчэўскага за сталом ў фінале пастаноўкі.

Бадзёра і весела праходзіць сцэна паміж Сцепанідай (арт. Андрэевіч) і Данілам (арт. Падбярэзін). Толькі Андрэевіч занадта крычыць, мітусіцца, што значна зніжае ўражанне ад яе ігры. Малады актор Падбярэзін больш роўна выконвае сваю ролю, але яму неабходна смялей трымацца на сцэне. Ролю нацдэмаўска-трацкісцкага паслядоўца Абабуркі добра вядзе арт. А. Г. Любімаў. Спачатку ён упэўнены і саманадзейны, адчувае сябе гаспадаром становішча і цвёрдым голасам гаворыць пра сябе: «Памалу, памалу друг... Абабурку дзе-ні-дзе яшчэ ведаюць». Але нічога ад яго саманадзейнасці і ўпэўненасці не застаецца, як толькі ён адчуў небяспеку. Артысту Любімаву ўдалося знайсці рад цудоўных дэталей, ускрываючых нутро гэтага шпіёна-дыверсанта.

Добра разыграна сцэна ў чацвёртым акце ў хаце Харкевіча. Гэта сцэна выклікае нянавісць і гідлівасць гледача да ворагаў народа. Арт. Мазурэнка стварыў удалы вобраз прадажнага дыверсанта-палявода Сільвестра Вырвіча, які за грошы дапамагае шпіёну Харкевічу. Гэтую асноўную рысу трэба было артысту паглыбіць у сцэне атрымання грошай, знайсці больш дэталей, лепш іх абыграць, каб ярчэй ускрыць прагнасць Вырвіча да грошай.

Арт. Юдзіна не зусім добра зразумела ролю Насці—дачкі Харкевіча, і трактуе яе няправільна. Насця—совецкая студэнтка, вясёлая, выпрыманая, ветлівая. Быць вясёлай гэта не значыць бегаць увесь час па сцэне і смяяцца, як робіць арт. Юдзіна. У чацвертым акце перад вачыма гледача праходзіць сцэна сутычкі дачкі з бацькам. Гэта сцэна вялікай напружанасці пабудавана на змене настрояў, і тут артыстка прыкметна пераігрывае. Замест вытрыманай і цвёрдай совецкай студэнткі атрымліваецца нейкая істэрычка.

Астатнія дзеючыя асобы: Буйко Міхась (арт. Сурко), Усенка (арт. Блажэвіч) і Дабрынін (арт. Васілеўскі) ідуць па агульнаму руслу станоўчых вобразаў і нічога асаблівага ў іх ігры нельга адзначыць.



Харкевіч—арт. Б. Савіч.
Мал. Е. Гаробчанка.

Падагульваючы ўсё сказанае, неабходна прызнаць, што гэты спектакль у цэлым пакідае прыемнае ўражанне і з'яўляецца значным творчым дасягненнем Рагачоўскага калгасна-саўгаснага тэатра.

В. ЗУБ.

ХРОНІКА

✦ У Магілеве закончыў гастролі Кіеўскі Дзяржаўны яўрэйскі тэатр юнага гледача. Тэатр паказаў сем пастановак, з якіх асаблівым поспехам карысталіся спектаклі «Дзвесце тысяч» Шолам-Алейхема і «Гершэле Острапалер» Гершэнзона.

✦ Віцебская і Слуцкая музычныя школы атрымалі новыя памяшканні. У школах з пачаткам навучальнага года ўводзяцца новыя дысцыпліны—па класу духавых інструментаў, народных інструментаў, баяна і інш.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Г—1452.